№ 36 (346) 3 кастрычніка 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Археалягічныя адкрыцьці году

Тэма нумару. Старонкі 6—7

## Генэрал Кларк

мае беларускія карані. Старонка 4

## Зянону Пазьняку

хапіла б і роты. Старонка 2

# Містэр Беларусь



Патрыярх беларускае дыяспары ў Амэрыцы Вітаўт Кіпель прывёз у Менск дачку Алесю і кнігу свайго жыцьця — «Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе». За плячыма — сорак гадоў падарожжаў і пошукаў. Старонка 5.

АРЦЁМ ЛЯВА

НАВІНЫ

### Саюзнага рубля ня будзе

**Саўмін «саюзнай дзяржавы» не зацьвердзіў праекту пагадненьня пра ўвядзеньне расейскага рубля ў якасьці адзінага плацежнага сродку на тэрыторыі Беларусі ад 2005 г.** Беларускі бок адмаўляецца пераходзіць на адзіную валюту, пакуль ня створаная адзіная эканамічная прастора — вольны рынак тавараў, паслугаў і рабочай сілы. Нягледзячы на працяглыя начныя перамовы Пуціна й Лукашэнкі, паглыбляюцца і супярэчнасьці ў справе расейскай уласнасьці ў Беларусі.

### «Волга» запрацавала

**Расейская радыёлякацыйная станцыя «Волга» пад Баранавічамі заступіла на баявое дзяжурства.** Яна здольная выяўляць у палёце балістычныя ракеты, а таксама касьмічныя аб'екты на адлегласьці ў тысячы кілямэтраў, суправаджаць іх і «пазнаваць». Эколягі мяркуюць, што станцыя можа дрэнна ўплываць на здароўе навакольных жыхароў.

### Кітай на дарозе прагрэсу

**З 1 кастрычніка кітайцам дазволена жаніцца бяз згоды працоўнага калектыву і перадвясельных мэдагляду.** Раней дзяржаўны чыноўнік мог адмовіць маладым толькі з тых меркаваньняў, што ў гэтай мясцовасьці выбраны гадавы ліміт нараджальнасьці. Новае сямейнае права ўзаконьвае таксама і разводы, якіх у Кітаі ўсё болей.

**СМ**

## Падтрымайма ліцэістаў!

Ужо месяц навучэнцы зачыненага Беларускага ліцэю займаюцца, пераходзячы з кватэры на кватэру. Тым ня менш, навучальны працэс не спыняецца. Самая вялікая псыхалягічная праблема — недахоп камунікацыі, немагчымасьць тусавацца на перапынках, разам бавіць вечары, адпачываць на дыскатэках у актавай залі, ладзіць спартовыя імпрэзы — усё тое, што маюць іншыя дзеці і што важна ня менш за наведваньне заняткаў. Без чаго не бывае школы.

Патрэбныя сродкі і магчымасьці на арганізацыю вольнага часу (абанэмэнты ў басэйн, квіткі ў тэатар, арэнда дыскатэкі, аплата эксурсій і г.д., памяшканьне для дзейнасьці ліцэйскага тэатру, органаў самакіраваньня, гурткоў па інтарэсах). Бацькам цяжка знаходзіць грошы на тое, што іншыя школьнікі маюць задарма. Просім зьвяртацца на тэлефоны актывістаў бацькоўскага камітэту Ліцэю: 0296-70-30-85 (Рэгіна), 242-85-16 (Сяргей).

Адважныя ліцэісты і іх цярплівыя бацькі — правобраз будучае свабоднае школы і будучага свабоднага грамадзтва. Падтрымайма ліцэістаў!

НАВУКА

# Берасьцейшына, Гомельшчына ператворацца ў стэп

**Зіма ўжо даўно не зіма, а ў траўні штогод прымаразкі. У тэлевізары то паводкі, то лясныя пажары. І ня дзе-небудзь, а ў блізкай і кліматычна ўмеранай Эўропе. Як будзе зьмяняцца клімат у Беларусі? Адказ на гэтае пытаньне даюць акадэмікі НАНБ у дасьледаваньні «Зьмены клімату Беларусі і іх наступствы».**

Значныя зьмены ў беларускім клімаце заўважныя ўжо цяпер. Ядро зімы перасунулася з студзеня на сьнежань, а ўвесну на два тыдні раней, чым у сярэдзіне мінулага стагодзьдзя, надыходзяць плюсавыя тэмпэратуры. Асабліва моцна ў выніку чалавечай дзейнасьці зьмяніўся клімат вялікіх гарадоў. У Менску, у параўнаньні з прыгарадамі, тэмпэратуры на 2—2,5°С вышэйшыя, больш ападкаў і пахмурных дзён, а сярэдняя працягласьць навальніцы ў два разы меншая, чым у Мар'інай Горцы (паўтары і тры гадзіны адпаведна). Колькасьць ападкаў у Беларусі зьменшылася ў параўнаньні з даваенным часам. Рэгулярна раз на два гады ў Гомельскай вобласьці і раз на два-тры гады ў Берасьцейскай адбываюцца лякальныя засухі. Іх маштабы робяцца ўсё большыя і большыя, часам ахопліваюць усю плошчу краіны. У пэрыяд з 1989 да 2002 толькі пяць гадоў не было моцнае сухаты. Найбольш ураджаю губляе Гомельшчына і поўдзень Магілёўшчыны. На мэліяраваных глебах (а гэта 16,4% беларускай тэрыторыі) пагоршыўся мікраклімат, значна пачасьцелі замаразкі. 300 тыс. га адпрацаваных тарфянікаў дэградавалі за апошнія дваццаць гадоў. На паверхню выйшлі пяскі. Зьмяняецца і расьлінны сьвет Беларусі. Углыб краіны прасоўваюцца стэпавыя і паўстэпавыя віды. На поўнач адыходзяць яліна эўрапейская, граб і алешына. Іх паядаюць шкоднікі, якія добра перажываюць цёплыя зімы. У прыватным сэктары вырошчваецца ўсё больш цеплалюбівых культураў.

Клімат Беларусі будзе схіляцца ў бок экстрэмальнасьці. Найбліжэйшыя дзесяць—пятнаццаць гадоў, пераходныя перад пацяпленьнем, будуць адзначаныя анамальна моцнымі маразамі ўзімку і анамальна гарачым летам, няўстойлівым надвор'ем увосень і ўвесну. Але ўжо ў сярэдзіне стагодзьдзя сярэднегадавая тэмпэратура павялічыцца на 1°С, а ў канцы — на 3—5°С. Гэтае пацяпленьне выкліча значныя зьмены ў асяродзьдзі.

Паводле прагнозаў, упадзе мінімальны ўзровень вады, пагоршыцца яе якасьць (фаўна ў рэках зьменіцца на больш цеплалюбівую, у выніку прыродная сыстэма самаачышчэньня вады разбурыцца).

Працяг на старонцы 11.

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Ключ ад таямніцаў неба



У Нью-Ёрку адкінуў канькі Эдвард Саід, а ў Беларусі нават ніхто не пачухаўся. Нонсэнс. Бо, не абвергнуўшы дактрыны Саіда, ніводная наша палітычная эліта ня будзе дрыхнуць спакойна. Быццам гадзіньнікавая бомба, ягоная тэорыя будзе час ад часу выбухаць у мазгах грамадзянаў спакусай паўстаньня супраць, як бліскуча давёў Саід, абсалютна штучнай Сыстэмы.

Галоўны тэзыс Саіда выкладзены ў кнізе «Арыенталізм» (1978). Сутнасьць «эўрыкі» ў тым, што Захад выпрацаваў комплекс павархоўных уяўленьняў аб Азіі, г.зв. «арыенталізм», які на самай справе зьяўляецца не сукупнасьцю аб'ектыўных ведаў, а «заходнім спосабам адносінаў да Ўсходу, які дазваляе панаваць над ім, перакройваць яго адпаведна сваім шаблёнам і падпарадкоўваць сваёй уладзе». Эўрапейская культура ня толькі здолела замацавацца на Ўсходзе, але, можна нават сказаць, яна стварыла «Ўсход». Гэтая тэхналёгія ня згінула пасьля калапсу каляніялізму. Посткаляніяльныя эліты ў пошуках эфэктыўнай мадэлі мэнэджмэнту стварылі ўласныя ў калянізатараў ідэю «арыенталізму» і паставілі вырабніцтва «ўсходаў» на канвэер.

Як функцыянуе «арыенталізм» на прыктыцы, відаць на прыкладзе роднага народу Саіда — палестынцаў. На працягу гісторыі іх нацыянальная ідэнтыфікацыя мянялася ў залежнасьці ад забабонаў палітыкаў. Пры турках жыхары Палестыны былі асманамі, падчас першай сусьветнай — арабамі, потым — бедуінамі, да мандату — сырыйцамі, падчас мандату — арабамі, пры габрэях — ярданцамі. Цяпер быццам яны зноў арабы і застануцца імі, пакуль камусьці ня стукне ў галаву зьляпіць зь іх новую нацыю. Напрыклад, «міжземнаморскіх крывічоў».

Такім самым чынам працуюць праэўрапейская і прарасейская бранжы беларускай эліты: прыдумваюць сваю Беларусь, сваю экзотыку, свае стэрэатыпы. Прыступы палкай фантазіі нацыяналіста нараджаюць на сьвет беларускага рыцара, пэрспэктывы кар'ернага росту натхняюць лукашыста на сцэнар «Настасьсі Слуцкай». Паладзіны патрэбны нацыяналістам, каб замацаваць тэзыс аб эўрапейскасьці беларусаў. Лукашэнку ня жыць безь мітычнага слуцкага фэадала, бо ягонаму абсалютызму бракуе гістарычнага падмурку.

Саід, узьняўшы праблему «арыенталізму», не падказаў выйсьця з сытуацыі. Між тым выхад відавочны. «Арыенталізму» трэба супрацьпаставіць новы калектыўны эпістэмалягічны падыход, які ня будзе мець нічога супольнага з адносінамі панаваньня. Гэта ня толькі вызваліць нацыю ад каляніяльных каштоўнасьцяў, але і адчыніць новыя, невядомыя заходняму рацыяналізму чалавечыя якасьці.

Вось што, напрыклад, пісала замежная прэса ў 60-я аб індыйскіх мааістах, якія змагаліся з каляніяльным дыскурсам, творча сынтэзуючы традыцыю і запаветы Маркса: «Самыя здольныя вучні Мао кінулі выклік сусьветнаму закону прыцягненьня. Тысячы працоўных у горадзе Сікім на мітынгу, які арганізаваў «Камітэт Лятучых Камуністаў», назіралі, як група мужчын з скрэсьленымі ў позе лётаса нагамі, пеючы «Інтэрнацыянал», адарвалася ад трыбуны і ўзьнялася над ёй. Камуністы разгарнулі ў паветры транспарант «Узьняць сьцяг ідэяў Мао над усім сьветам!». Пасьля гэтага палітычны давер працоўных штату быў заваяваны. Між тым самі марксісты-ленінцы сьціпла ацэньваюць свой палёт, сьцьвярджаючы, што гэта былі толькі падскокі. Цяпер яны аваладваюць другім узроўнем — вучацца лунаць. Каб паляцець, неабходна кіравацца законам і пастулятам навуковага камунізму — тэорыяй Мао Цзэдуна. Дабіцца гэтага дазваляе тэхніка рэвалюцыйнай працы, спэцыяльная практыка дыханьня — сыстэма пазасан. Нялёгкі шлях клясавай барацьбы, аднак той, хто пройдзе яго, атрымае ключ да таямніцаў неба».

Чулі, спадары дэмакраты, — «ключ да таямніцаў неба»! А вы мне ўсё пра ВКЛ і аб тым, што пры Эўразьвязе мінімалка будзе пад сто баксаў.

**Лёлік Ушкін**

ПРАВЫМ ВОКАМ

# Прывід камунізму*



Камунізм у Беларусі вяртаецца ў пачатковы стан — той самы, у якім ён, быццам джын з бутэлькі, выбраўся калісьці з «Маніфэсту» Маркса. Усё радзей сустрэнеш у тралейбусе жывога артадокса, усё менш бабулек з чырвонымі сьцягамі ля помніка Леніну 7 лістапада, дый рэйтынг абедзьвюх кампартыяў ужо колькі гадоў, як генэральная лінія, вагаецца каля статыстычнае хібнасьці.

Нават на выбарах у Расеі прывід камунізму ўжо не такі жахлівы: усе ведаюць, што Зюганаў ніколі не пераможа, мала таго — будзе найзручнейшай апазыцыяй.

Але адначасова чырвоная здань матэрыялізуецца ў калідорах сёньняшняе беларускае ўлады. Адміністрацыйна-камандная сыстэма, плянавая эканоміка зь дзяржаўнай маёмасьцю, афіцыйна савецкая настальгія й левая рыторыка... Чырвань займае столькі ж месца ў цяперашняй Беларусі, колькі й на дзяржаўным сьцягу. Лукашэнка мае поўнае права абвесьціць: «Прашу лічыць мяне камуністам!»

Дзіўна, што пры гэтым пераемніца беларускай кампартыі, ПКБ Калякіна, трапіла ў пяцёрку самых дэмакратычных партыяў апазыцыі. Кажуць, што гэта ўжо зусім ня тыя камуністы, што яны больш падобныя да эўрапейскіх сацыялістаў. Што Калякін тыповы парлямэнцкі лідэр, які дасьць фору правым у сваім дэмакратызьме...

Можа, і так.

Але непамысна: як гэта — без пакаяньня за рэвалюцыйны тэрор, калектывізацыю, Курапаты, разбурэньне храмаў... Бязь зьмены лёзунгаў, арыентацыяў і праграмаў... З партрэтамі Леніна й Сталіна.

Калі назіраеш апазыцыйныя шэсьці на той жа Ўкраіне, дзе чырвоныя сьцягі зь сярпом-молатам ды партыйнымі іконамі 70-х мяшаюцца з жоўта-блакітнымі ды УНСОўскімі палотнішчамі, — пацыху, даруйце, шызееш. Не хачу хадзіць на Дзяды ці Чарнобыльскі шлях разам з фанатамі Палітбюро й НКВД! Не хачу іх агітаваць за «супольны брэнд» ці «супольны сьпіс» з кап-эсэсаўцамі! Моташна. Сярод ідэйных камуністаў у Беларусі я дагэтуль бачыў толькі адно выключэньне — Валер'я Шчукіна. І менавіта яго, калі памятаеце, спадар Калякін выключыў з сваёй партыі «за нацыяналізм».

У любых умовах існуюць скрайнія межы, за якімі дэмакратыя перастае быць дэмакратыяй, палітыка — палітыкай, а апазыцыя — апазыцыяй. Гэта фашызм, камунізм, анархізм і тэрарызм. Фашыстоўскія й камуністычныя партыі трэба заканадаўча забараняць — інакш Гітлер або Сталін робяцца адно пытаньнем часу.

Камуністы й камсамольцы, выйсьці з шэрагу!

Або кайцеся й ружавейце — або будзьце праклятыя, таварышы!

**Павал Севярынец**

* Пазыцыі аўтараў паласы «Камэнтары й меркаваньні» могуць не супадаць з пазыцыяй Рэдакцыі.

# Зянон Пазьняк: «Была, ёсьць і будзе вечна!»

**На пытаньні карэспандэнта «НН» адказвае старшыня Кансэрватыўна-хрысьціянскае партыі — БНФ Зянон Пазьняк.**



**«НН»: Нядаўна мы сталі сьведкамі падпісаньня ялцінскага пагадненьня. Як Вы яго ацэньваеце і якімі Вам бачацца ягоныя наступствы для Беларусі?**

**Зянон Пазьняк:** Такога роду «пагадненьняў» ужо было шмат, яны будуць яшчэ. Гэта чарговае зьвяно ў маскоўскім ланцугу «пакрокавай» палітыкі, якую кіруючая расейская гэбэ вось ужо дзевяць гадоў рыхтуе і вядзе разам з Лукашэнкам. Павольнасьць працэсу тлумачыцца ня толькі тактыкай, але найперш праблемай аплаты за здачу Беларусі.

Ізноў жа, справа ня ў тым, што вышэйшая службовая асоба ў Беларусі зашмат хоча, а ў тым, чаго яна ня хоча разумець. Расея, як НКВД ніколі не ўзнагароджвалі за здраду. Цана гандлю мае ўмоўнае значэньне. Бо, атрымаўшы жаданае, расейцы прадажнікаў заўсёды зьнішчалі. Калі не адразу, то потым. Хоць бы тыя здраднікі прадалі ім усю плянэту Зямлю і хоць бы за капейку.

Калі б — зьвернемся да ўмоўнасьці — у сытуацыі, якая ўзьнікла пасьля ялцінскага спэктаклю Пуціна—Лукашэнкі, у Беларусі раптам стаў бы прэзыдэнт і ўрад Народнага фронту, маскоўцы моцна прайгралі б. Газавы шантаж абярнуўся б супраць іх.

Дарэчы, не забывайма, што магчымасьць газавага шантажу Лукашэнка даў Расеі яшчэ ў 1995 г., калі ацяпляльная і прамысловая сыстэмы Беларусі былі пераведзеныя з мазуты і салярки на газ, хоць салярка і мазута абыходзіліся нам значна таньней.

Паршывую авечку зашмаргнулі, і яна мірна вядзе бараноў на бойню, да чарговага «кроку» — незаконнага ўвядзеньня расейскага рубля, потым — да незаконнага рэфэрэндуму аб «канстытуцыйным акце» і г.д. Тым часам самі расейцы выказваюцца проста і па-лейтэнанцку, як Пуцін, без дыпламатыі. Віцэ-міністар фінансаў Расеі А.Улюкаеў сказаў 11 верасьня ў газэце *«КоммерсантЪ»*: «Масква ня будзе ўцягвацца ў спрэчкі, калі і ў якой форме расейскі рубель будзе легалізаваны ў Беларусі, — галоўнае, каб рублёвы аншлюс Беларусі адбыўся. Толькі ў гэтым выпадку расейскі капітал зможа ўдзельнічаць у прыватызацыі беларускай транзытнай транспартнай інфраструктуры».

**«НН»: Вы скептычна ставіцеся да «нацыяналізму» Лукашэнкі. Але ці дапускаеце Вы, што ў пэўнай сытуацыі ён можа пераарыентавацца на Захад і знайсьці там падтрымку сілаў, зацікаўленых у аслабленьні пазыцыяў Расеі ў Эўропе?**

**З.П.:** Не дапускаю. Гэта супярэчыць ягонай антызаходняй «натуры» і ўсёй антыбеларускай унутранай палітыцы. Падтрымкі ў заходняй Эўропе ён ня знойдзе, бо Эўропа, дзе тон задаюць Нямеччына і Францыя, арыентаваная на дачыненьні і гандаль з Расеяй. «Сілаў, зацікаўленых у аслабленьні пазыцыяў Расеі ў Эўропе», не існуе, бо ніякіх «пазыцыяў» Расея ў Эўропе ня мае. Тым часам Амэрыку, якая абяцалася быць гарантам беларускай незалежнасьці, Лукашэнка даўно аб'явіў сваім «асабістым ворагам».

**«НН»: Ці застанецца нязьменнай пазыцыя ЗША ў дачыненьні да рэжыму Лукашэнкі?**

**З.П.:** Гэта будзе залежаць найперш ад саміх беларусаў, прытым ня толькі на Бацькаўшчыне, але і ва ўсім сьвеце. Ад здольнасьці іх да супраціўленьня расейскай палітычнай агрэсіі, ад актыўнасьці палітычных сілаў беларускага Вызвольнага Руху (Беларускі народны фронт «Адраджэньне», Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя — БНФ і інш.). У другую чаргу гэта будзе абумоўлена дзеяньнямі Эўропы і геапалітычнай сытуацыяй ва Ўсходняй Эўропе. Калі «другая чарга» стане «першай» — гэта будзе вельмі кепскі знак і фатальныя наступствы для Беларусі.

**«НН»: Ці бачыце Вы сярод нацыянальных сілаў патэнцыйных саюзьнікаў КХП-БНФ?**

**З.П.:** Невядома, што вы маеце на ўвазе пад «нацыянальнымі сіламі». Калі ўсю беларускую нацыю, то найпершымі нашымі саюзьнікамі ёсьць тыя людзі, што стаяць і будуць стаяць на пазыцыях Акту 25 Сакавіка 1918 г. Тыя ж зь іх, што здольныя да змаганьня, дзейнасьці і барацьбы за гэтыя ідэалы, стануць у нашыя шэрагі.

**«НН»: У Беларусі існуе «пяцёрка» апазыцыйных партыяў, якая рыхтуецца ісьці на выбары ў палату прадстаўнікоў агульным сьпісам. Ці можа Ваша партыя далучыцца да гэтага аб'яднаньня?**

**З.П.:** Калі Масква ўвядзе на Беларусь свае грошы і замацуе сваю палітыку праз рэфэрэндум аб «канстытуцыйным акце», ніякіх выбараў больш ня будзе. І «палата» стане непатрэбнай. Хутчэй за ўсё, адразу ўвядуць становішча пераходнага пэрыяду да «адзінай саюзнай дзяржавы» і г.д., з усімі выходзячымі адсюль вынікамі, дзеяньнямі і рэпрэсіямі. Трэба змагацца, каб не дапусьціць рэфэрэндуму і расейскіх грошай, падрыхтаваць нацыю да байкоту незаконнага рэфэрэндуму, калі яго нам навяжуць. А чарговая «кааліцыя» барацьбе Фронту супраць увядзеньня расейскіх грошай і падрыхтоўкі незаконнага рэфэрэндуму процістаўляе заклік рыхтавацца... да выбараў у «палату».

Падстаўной «апазыцыі» адведзена вельмі абмежаваная і вузенькая роля: дэманстраваць зь сябе «апазыцыю» і паказваць сваю слабасьць ды нікчэмнасьць. Доступ да мэдыяў, дарога ў парлямэнт і ў саветы для гэтай «апазыцыі» не прадугледжаныя і не дазволеныя. Тут пабудаваная сьцяна, якую (таму, хто сапраўды хоча змагацца) можна абысьці, паваліць ці пабурыць збоку, але ня ў лоб. «Кіраваную апазыцыю» ўвесь час (як тую паршывую авечку) штурхаюць ісьці ў лоб — на выбары ды на рэфэрэндум, якія яна тут у прынцыпе ня можа выйграць, але сьцягне электарат і легітымізуе фальсыфікацыю.

Калі расейцам пры дапамозе «апазыцыі» ўдасца забраць Беларусь, то гэтая апазыцыя будзе таксама ліквідаваная імі, разам з Лукашэнкам. Калі ж Масква адкладзе свой плян з рэфэрэндумам у Беларусі на потым, то выбары ў «палату» адбудуцца. «Кіраваную апазыцыю» туды не прапусьцяць, хіба пару маргіналаў. Эўропа ж будзе імкнуцца прызнаць новую «палату».

**«НН»: Але на мінулых выбарах у мясцовыя саветы, якія байкатавала КХП-БНФ, дэпутатамі сталі некалькі дзясяткаў дэмакратычных кандыдатаў.**

**З.П.:** У мясцовыя саветы «выбрана» 20 тысячаў дэпутатаў. Сярод іх прапусьцілі 15—20 маргінальных прадстаўнікоў ад «апазыцыі». Ліміт мог быць і меншым. Гэта было пададзена як вялікая «палітычная перамога апазыцыі».

«Свае людзі» ў саветах пажаданыя тады, калі выбары дэмакратычныя, справядлівыя і легітымныя. Ва ўсіх астатніх выпадках гэта вельмі сумнеўная і спрэчная справа. Хаця часам і магчымая, гледзячы на сытуацыю.

**«НН»: Ці дапускаеце Вы магчымасьці адкрытага вайсковага ўмяшаньня Расеі ў справы Беларусі?**

**З.П.:** Адкрытае вайсковае ўмяшаньне Расеі цяпер малаверагоднае, бо ўсё падрыхтавана якраз да «ціхай акупацыі», і яна рухаецца даволі пасьлядоўна.

Калі б беларусы былі здольныя на збройную барацьбу, то хапіла б роты, каб усё перамяніласа, і ніякае вайсковае ўмяшаньне ўжо ня выратавала б Маскву.

**«НН»: Як, па-Вашаму, увойдзе ў гісторыю пэрыяд існаваньня Рэспублікі Беларусі?**

**З.П.:** Што датычыць «пэрыяду існаваньня», то выглядае, што некаторыя пачалі ўжо заранёў хаваць Рэспубліку Беларусь. Але тых, хто сьпяшаецца, чакае расчараваньне. Беларусь была, ёсьць і будзе вечна!

**Запісаў Сяргей Ёрш**

# Коласа у прэзыдэнты

**Сьледам за Коласам-пісьменьнікам беларусы могуць займець Коласа-прэзыдэнта. 25 верасьня, падчас он-лайн-канфэрэнцыі на радыё «Свобода», дырэктар Беларускага ліцэю Ўладзімер Колас заявіў, што не адкідае магчымасьці вылучэньня сваёй кандыдатуры на пасаду прэзыдэнта. У апошнія месяцы Колас і ягоная навучальная ўстанова знаходзяцца ў цэнтры ўвагі СМІ, але такая заява прагучала сэнсацыйна. Гэты двухмэтровага росту кінарэжысэр і пэдагог дагэтуль удзельнічаў у палітыцы толькі апасродкавана — праз Кангрэс беларускай інтэлігенцыі. Уладзімер Колас адказвае на пытаньні карэспандэнта «НН».**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**«НН»: Спадару Колас, ці слушна мы зразумелі сэнс тае Вашае заявы?**

**Уладзімер Колас:** Заяву я тую зрабіў не без іроніі... Мне здаецца, кожны ў думках прымярае на сябе прэзыдэнцкую «мантыю» і думае, што зрабіў бы, калі б апынуўся на гэтай пасадзе. Я таксама пра гэта думаў.

**«НН»: І што б Вы зрабілі?**

**У.К.:** Трэба зьмяняць курс краіны, палітыку, стратэгію дзеяньня ўлады. Трэба думаць, якія патрэбы ў краіны і народу, які тут жыве, а не займацца авантурамі дзеля задавальненьня ўласных амбіцыяў і захаваньня ў сваіх руках улады. Важна таксама кансалідаваць грамадзтва.

**«НН»: Ці маеце Вы ўжо нейкую палітычную плятформу?**

**У.К.:** Я схіляюся да прагматычных мэтаў. Палітыку трэба будаваць такім чынам, каб яна адпавядала сучаснаму стану грамадзтва і яго аптымальнаму разьвіцьцю. Ня трэба ставіць мэтаў абстрактных, рамантычных, узьнёслых, адарваных ад рэальнасьці, як ужо было раней і што прывяло да сёньняшняй сытуацыі. У праграме мусіць быць і сацыяльная абарона, і пэўныя лібэральныя захады, перадусім у пабудове рынкавых адносінаў. Трэба пазьбягаць нэгатыўнага досьведу іншых краінаў, напрыклад у справе першапачатковага накапленьня капіталу, з усімі наступствамі — алігархамі, бандытызмам...

**«НН»: На якія сілы ў грамадзтве думаеце абапірацца?**

**У.К.:** На вялікі жаль, асэнсаванай кансалідацыі ў грамадзтве пакуль няма. Гэтае пытаньне самае галоўнае. У ім — праблема і цяжкасьць. Але сілы такія ў грамадзтве растуць. Гэта людзі, якія здольныя да рэфлексіяў, безумоўна, гэта інтэлектуальныя сілы.

**«НН»: Калі Вы ўсё ж пойдзеце на выбары, каго лічыце сваім галоўным супернікам?**

**У.К.:** Супернік ва ўсіх павінен быць адзін — Аляксандар Рыгоравіч. Але калі ён паступіць паводле закону і ня будзе выстаўляць на выбарах сваёй кандыдатуры, тады пытаньне вырашыцца па-іншаму. Калі будзе больш дастойная за маю кандыдатура, я ня буду выстаўляцца на выбары.

**Размаўляў Сяргей Ёрш**

# У «МФ» пра FM



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Сяржук Кручкоў, Аляксандар Кулінковіч, Піт Паўлоў пакуль ня маюць падставаў для аптымізму.**

У аўторак у новай штаб-кватэры «Маладога фронту» цягам дзьвюх гадзінаў ішла жывая дыскусія па праблеме беларускага музычнага вяшчаньня. У ёй узялі ўдзел журналісты, музыканты і палітыкі. Прадстаўнікі FM-станцыяў прыйсьці на сустрэчу ня здолелі.

Абмяркоўваўся загад Мініфармацыі аб 50-працэнтным напаўненьні этэру беларускай музыкай і праблемы, ім выкліканыя. Кіраўнік МФ Павал Севярынец зазначыў, што загад выконваецца з наўмыснымі скажэньнямі (за беларускую, прыкладам, лічыцца творчасьць «Би-2», Барыса Маісеева, беларускамоўная ж музыка цалкам ігнаруецца).

**Працяг на старонцы 3.**

# Заўхозы ў мыле



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

У мінулую пятніцу, 26 верасьня, навучэнцаў Беларускага ліцэю пазбавілі адразу двух памяшканьняў: Чырвонага касьцёлу й Дому літаратара. У касьцёле сустрэча выкладчыка зь ліцэістамі была перапыненая тамтэйшым «заўхозам», які забараніў далейшыя спатканьні. Як высьветлілася, «заўхоз» мае большую ўладу, чым ксёндз Уладзіслаў Завальнюк…

Адзначыўся й камэндант Дому літаратара сп.Праваловіч. Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта, якому належыць будынак, неаднакроць спрабавала выгнаць адтуль літаратурныя курсы, на якія ходзяць у тым ліку й навучэнцы ліцэю. Саюзу беларускіх пісьменьнікаў, пад эгідай якога адбываюцца курсы, закідалі парушэньне правілаў пажарнай бясьпекі. Калі ж выявілася беспадстаўнасьць гэтых абвінавачаньняў, камэндант проста выразаў замкі ў бібліятэцы Дому літаратара і ўставіў новыя. Час для гэтага быў абраны самы «злачынны» — у ноч з пятніцы на суботу пасьля 22-й гадзіны. «Сп.Праваловіч заявіў, што бібліятэка выкарыстоўваецца не па прызначэньні: там павінны быць чытачы, а не праводзіцца разнастайныя курсы. Апрача таго, ён сказаў, што калі палічыць патрэбным, дык зачыніць ня толькі бібліятэку, але й праўленьне Саюзу пісьменьнікаў», — распавёў намесьнік старшыні СБП Міхась Скобла. Аднак наўрад ці варта вінаваціць толькі камэнданта будынку: каб уначы перад выхадным днём прыгнаць рабочых для замены замкоў, трэба рашэньне больш высокіх структураў.

Бібліятэка Дому літаратара больш за год стаяла зачыненай: праз фінансавыя праблемы Саюз пісьменьнікаў ня мог аплачваць працу бібліятэкара. Як стала вядома «НН», Кіраўніцтва справаў пры канцы жніўня ўжо зьвяртала ўвагу пісьменьніцкай арганізацыі на марнаваньне памяшканьня: маўляў, стаіць пустая бібліятэка, ніхто ёй не карыстаецца. Утварэньне літаратурных курсаў дазволіла выкарыстаць пустое памяшканьне: на грамадзкіх пачатках стаў працаваць бібліятэкар, кнігамі карысталіся й самі сябры СБП. Тутсама праходзілі й сустрэчы зь пісьменьнікамі. Апошняй па часе была прэзэнтацыя кнігі Зоры й Вітаўта Кіпеляў «Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе», якая адбылася якраз 26 верасьня. Цяпер праца бібліятэкі зноў спаралізаваная. «Гэта парушэньне правоў пісьменьніцкай арганізацыі», — лічыць М.Скобла.

Аднак «заўхозаўскія» меры істотна не адбіліся на дзейнасьці Беларускага ліцэю. Лявон Баршчэўскі зазначыў: «Ніводная кансультацыя не была сарваная. У некаторых выпадках іх даводзілася праводзіць у горшых умовах, але гэта, думаю, часова».

**Аркадзь Шанскі**

## ● ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА ●

### Перабудова Пружанаў каштавала 30 млн даляраў

**60 млрд руб. выдаткавана на падрыхтоўку Пружанаў да «Дажынак-2003», якія пройдуць 3—4 кастрычніка.** На добраўпарадкаваньні ў першыя тыдні штодня было занята 50—100 чалавек, на заключным этапе — да 4 тыс. Праца ішла кругласутачна. Пабудавалі новую аўтастанцыю і палац культуры, перабудавалі гатэль; абнавілі рэстаран, унівэрмаг, рынак; у дамах памянялі шыбы, дахі, дабудавалі мансарды; пракалі новыя камунікацыі; трацінy вуліц заасфальтавалі, на ходніках паклалі плітку. 4—5 кастрычніка ўводзіцца дадатковая электрычка Менск—Аранчыцы. Для параўнаньня: на добраўпарадкаваньне Смургоняў, якім сёлета 500 гадоў, пайшло 7 млрд рублёў.

### Разьвітаньне з «васьмёркай»

**АўтаВАЗ у аўторак выпусьціў апошні аўтамабіль «Лада-2108».** Кампанія вырашыла спыніць выпуск гэтай мадэлі ў сувязі з павелічэньнем аб'ёмаў вытворчасьці аўтамабіляў «Лада-115» і «Лада-114». Запасныя часткі для «Лады-2108» рабіць будуць і надалей.

### Кампанія энэргазьберажэньня пачалася

**Старшыня Менскага гарвыканкаму Міхаіл Паўлаў загадаў выпрацаваць і зацьвердзіць схему энэргазьберагальных захадаў** для кожнага з аб'ектаў, што знаходзяцца ў камунальнай уласнасьці. Загад зьвязваецца з падвышэньнем цаны на расейскі газ.

### Мільярд на заапарк

**У кастрычніку пачнецца будаўніцтва другой чаргі Менскага заапарку.** З гарадзкога бюджэту на гэта выдаткаваны мільярд рублёў. Мяркуюць збудаваць 10 вулічных вальераў, трапічны павільён для экзатычных жывёлаў, дзіцячую гульнявую пляцоўку і дзіцячы заапарк, дзе разьмесьцяцца адмысловыя вальеры для жывога кантакту наведнікаў зь дзіцянятамі жывёлаў, гаспадарчыя і складзкія памяшканьні. Усяго ў Менскім заапарку 600 жывёлаў 160 відаў.

### Пошліны на запалкі

**З 27 верасьня Ўкраіна ўвяла антыдэмпінгавыя меры ў адносінах да імпарту запалак з Расеі і Беларусі тэрмінам на пяць гадоў.** Для беларускіх вытворцаў памер мыта высокі: ЗАТ «Пінскдрэў» — 31,8%, «Барысаўдрэў» — 68,7%, іншых вытворцаў — 95,7%.

### Рэформа «Газпрому» адкладзеная

**Урад Міхаіла Касьянава зьняў з парадку дня рэформу «Газпрому».** Расейская прэса бачыць тут руку Пуціна. Рэформа — гэта падзел канцэрну на два прадпрыемствы, адно зь якіх будзе здабываць газ, а другое — кіраваць газаправодамі і кампрэсарнымі станцыямі. Наступны этап рэформы меў на ўвазе паступовую лібэралізацыю газавага рынку і цэнаў на ім. Нечаканае рашэньне Касьянава адклала гэтыя пляны на няпэўны тэрмін.

### Гастарбайтарскія скандалы ў Нарвэгіі

**Нарвэскіх фэрмэраў абвінавацілі ў тым, што яны стварылі для сэзонных работнікаў зь Сярэдняй Эўропы рабскія ўмовы працы.** Газэта «Aftenposten» напісала пра агародніка Магнэ Крысьціяна Дыстэ, які за 10—13-гадзінны працоўны дзень плаціў работнікам з усходу каля 75 крон (10 даляраў). Нарвэжцам мусіў бы плаціць 81 крону за гадзіну. Работнікі жылі ў бараках, на трыццаць чалавек прыходзілася адна прыбіральня і два душы. На публікацыі мусіў зрэагаваць фэрмэрскі прафсаюз.

**СП; БелаПАН**

# Прэзыдэнт Немяроўскі

**Наступным амэрыканскім прэзыдэнтам можа стаць нашчадак выхадца зь Беларусі Ўэсьлі Кларк.**



WWW.NATO.INT

Гэты чатырохзоркавы генэрал у адстаўцы як ніхто іншы адпавядае чаканьням шараговых амэрыканцаў. Народ расчараваны стратамі ў Іраку і дэзарыентаваны пасьля тэрактаў 11 верасьня. У выбаршчыкаў расьце давер да людзей, зьвязаных з сфэрай бясьпекі. «Нам патрэбны хтосьці, да каго мы будзем зьвяртацца «генэрал», — выказаў гэтыя настроі адзін з камэнтатараў. Таму Ўэсьлі Кларк і мае найбольшую папулярнасьць сярод дзевяці прэтэндэнтаў, зь якіх Дэмакратычная партыя будзе вылучаць кандыдата на прэзыдэнцкія выбары. Заява пра тое, што Кларк ідзе на выбары, стала сэнсацыяй.

Цікава, што ў радаводзе генэрала Ўэсьлі — нашчадак выхадца зь Беларусі. Вядома, што яго дзед, на прозьвішча Немяроўскі, у 1890-я зьехаў на Захад, ратуючыся ад пагромаў. Трапіў спачатку ў Швайцарыю, дзе здабыў фальшывы пашпарт на прозьвішча Канэ, а ўжо адтуль эміграваў у Штаты. Бацька Ўэсьлі быў адвакатам у Чыкага. Пасьля яго сьмерці маці генэрала другі раз выйшла замуж. Айчым усынавіў Уэсьлі, адсюль падвойнае прозьвішча Канэ-Кларк. Пра дзеда хлопец даведаўся ў 20 гадоў, калі яго адшукалі стрыечныя браты, нашчадкі таго ж старога Немяроўскага. Уэсьлі некалькі разоў наведваў сваю цётку, каб распытацца пра бацьку і дзеда.

Агітацыйная кампанія Кларка пачалася яшчэ да таго, як ён заявіў аб сваім рашэньні балятавацца. Кампанія зьнізу, ініцыяваная праз Інтэрнэт двума яго прыхільнікамі, набрала вялікую моц. Мноства людзей дасылаюць яму лісты кшталту: «Генэрал, вы стаўце сваю кандыдатуру, вы нам патрэбны!» З такой просьбай зьвярнуўся да яго і оскараўскі ляўрэат Майкл Мур.

Кларк, як і большасьць прэзыдэнтаў ЗША, выхадзец з Поўдня. Кар'еру ён, як і Біл Клінтан, пачаў у Арканзасе. Апанэнты з рэспубліканскага лягеру бачаць у гэтым падвох: маўляў, слабы кандыдат Кларк ня зможа стаць прэзыдэнтам у 2004 г., але расчысьціць для Гілары дарогу да выбараў'2008. Пагаворваюць і аб іншым сцэнары: Кларк можа прапанаваць былой першай лэдзі стаць віцэ-прэзыдэнткай ЗША. Гэта прыцягне да яго галасы жанчынаў.

Гэты сцэнар здаецца верагодным: прэзыдэнцкую кампанію Кларка будуць весьці паліткансультанты, якія апекаваліся Клінтанам.

Кларку 58 гадоў, ён скончыў Оксфардзкі ўнівэрсытэт, быў найлепшым выпускніком свайго году ў акадэміі Ўэст-Пойнт, прайшоў усе прыступкі вайсковае лесьвіцы. Чын генэрала — найвышэйшы з усіх, якіх можна дасягнуць у амэрыканскім войску ў мірны час. Хоць наўрад ці Кларку гэты час падаваўся мірным. Ён ваяваў у Віетнаме, чатыры разы быў паранены, з 1997 да 2000 г. узначальваў войскі NATO ў Эўропе і ваенную апэрацыю ў Косаве. Яна лічыцца вельмі пасьпяховай, бо падчас яе не загінуў ніводзін амэрыканскі салдат. Падчас Югаслаўскай кампаніі 1999-га Кларк прапаноўваў не абмяжоўвацца авіяўдарамі, за што Клінтан і адазваў яго з Эўропы. Праціўнікі закідаюць яму жорсткую пазыцыю ў Югаславіі, але прыгадваюць сустрэчу Кларка ў 1994 г. з Раткам Младзічам, галоўным вайсковым злачынцам, ачольнікам войскаў Рэспублікі Сэрбскай. Яны нібыта нават мяняліся фуражкамі.

Увогуле ж Кларк мае рэпутацыю рэдкага ў амэрыканскай дый у любой арміі інтэлігента.

Пасьля 11 верасьня Белы Дом зьвярнуўся да Кларка з прапановай стаць дарадцам ураду ў барацьбе з тэрарызмам. Генэрал адказваў за кантакты з эўрасаюзьнікамі й Расеяй падчас вайны ў Аўганістане. (Кажуць, што ён нават ведае расейскую мову.) Генэрал удзельнічаў у напісаньні трактату пра супрацоўніцтва Расеі і NATO.

А вось другую ірацкую вайну генэрал жорстка крытыкаваў, чым здабыў нелюбоў рэспубліканцаў. Цягам усёй апэрацыі ён скептычна камэнтаваў яе на канале CNN. У кастрычніку мае выйсьці яго кніга «Як перамагаюць у сучасных войнах» — працяг бэстсэлеру «Як вядуць сучасныя войны».

**Вераніка Дзядок**

# Ім абіраць Папу

Апоўдні ў нядзелю Ян Павал II абвясьціў імёны 30 новых кардыналаў. Сярод іх — міністар замежных справаў Ватыкану арцыбіскуп Жан-Люі Таран; старшыня Папскай Рады «Justitia et Pax», міністар грамадзка-палітычна-эканамічных справаў арцыбіскуп Рэната Марціна і яшчэ пяць дзеячоў Рымскай курыі. У сьпісе таксама 19 «мясцовых» біскупаў — тры італьянскія, два францускія і па аднаму з ЗША, Нігерыі, Судану, Шатляндыі, Бразыліі, Індыі, Віетнаму, Гватэмалы, Вугоршчыны, Канады, Ганы, Харватыі, Аўстраліі, Гішпаніі. Сан нададзены таксама шэрагу заслужаных тэолягаў, у ліку якіх паляк, былы выкладчык Люблінскага каталіцкага ўнівэрсытэту Станіслаў Нагі і тэоляг Папскага дому (прыдворны спэцыяліст) швайцарац Жорж Кацье.

Але найбольшая сэнсацыя — сакрэтная намінацыя «in pectore» (даслоўна — «у сэрцы»). Раней «in pectore» зазвычай рабіліся біскупы з краінаў, дзе Касьцёл перасьледавалі. Гэтым разам, магчыма, намінацыю атрымаў асабісты сакратар Папы Станіслаў Дзівіш. Ён ужо сорак гадоў працуе поруч з Папам. Падчас трагічнай спробы замаху ў 1981 г. Дзівіш ехаў разам з Папам у адкрытым аўтамабілі. Паводле неафіцыйных зьвестак, ён мае стаць наступнікам кардынала, кракаўскага мітрапаліта Францішка Махарскага, які ўжо дасягнуў пэнсійных гадоў (яму 75). Але можа быць таксама, што гэтым «сакрэтным» кардыналам стаў адзін зь біскупаў кітайскага «падпольнага» касьцёлу, непрызнанага ўладамі КНР. У любым разе, Папа назваў таямнічага намінанта «яшчэ адным заслужаным біскупам».

Такім чынам, колькасьць кардыналаў, маладзейшых за 80 гадоў, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах Папы, вырасла да 135. Некаторыя зь іх, аднак, ненамнога маладзейшыя. Самаму стараму кардыналу цяпер 100 гадоў, два наймаладзейшыя нарадзіліся ў 1945-м. Кіраўнік Касьцёлу ў Беларусі Казімер Сьвёнтак таксама мае годнасьць кардынала.

Папа ў нядзелю насілу чытаў сьпіс кардыналаў.

**СП; «Gazeta Wyborcza»**



AP

**Ян Павал II і ягоны сакратар Станіслаў Дзівіш.**

# Ажыятаж на «Палягры»

**У Познані (Польшча) прайшла Міжнародная выстава-кірмаш харчовай прамысловасьці «Polagra-Food 2003». Туды прыбылі прадстаўнікі 770 фірмаў і арганізацыяў з 35 краінаў сьвету. Беларуская дэлегацыя склала аж 18 чалавек.**

Прапановы фірмаў, якія выставілі на кірмашы сваю прадукцыю, вельмі разнастайныя — ад мяса-малочнай ды віна-гарэлачнай прамысловасьці да вытворчасьці ўпаковак для прадуктаў харчаваньня.

Нашыя бізнэсоўцы былі зьдзіўленыя той цікавасьцю, якую выявілі да іх прадукцыі замежныя калегі. «Вось я прастаяў на стэндзе некалькі гадзінаў і бачу, як адбываецца жывая гутарка. І першае пытаньне польскіх прадпрымальнікаў: як увайсьці на беларускі рынак, як сэртыфікуецца тавар, як што зрабіць, — кажа старшыня менскага Саюзу прадпрымальнікаў і працадаўцаў Уладзімер Карагін. — Польскія бізнэсоўцы цікавяцца адрасамі розных дзяржаўных установаў, органаў дзяржаўнай сэртыфікацыі й стандартызацыі, адрасамі канкрэтных беларускіх фірмаў, якія займаюцца канкрэтнымі відамі прадукцыі».

Ці польскія прадпрымальнікі больш зацікаўленыя экспартам сваёй прадукцыі ў Беларусь, ці інвэставаньнем на тэрыторыі краіны? «Прадпрымальнікі зацікаўленыя прыбыткам, — гаворыць Карагін. — І вось яны ў мяне пытаюцца: чым выгадней займацца — экспартам, імпартам ці вытворчасьцю? У кожным асобным выпадку гэта па-рознаму. Ёсьць віды прадукцыі, якія ў Беларусі мы б не рэкамэндавалі выпускаць, таму што існуе дзяржаўная манаполія. Напрыклад, перапрацоўка рыбы. Каб займацца такой дзейнасьцю, трэба атрымаць ліцэнзію ў Адміністрацыі прэзыдэнта. Гэта даволі працяглы працэс, а як гэта рабіць — ніхто ня ведае, таму што няма інструкцыі. На рынках асобных тавараў яшчэ вакуум, і тут сапраўды можна актыўна займацца вытворчасьцю — напрыклад упакоўкі».

Прыгожа выглядаў і стэнд аб'яднаньня «Віцебскхарчпрам». Калі казаць дакладна, прыгожа выглядала прадукцыя холдынгу: агародніннья кансэрвы, кандытарскія вырабы й алькаголь. Відаць, што над упакоўкай тавараў працавалі дасьведчаныя дызайнэры.

У склад «Віцебскхарчпраму» ўваходзіць 15 прадпрыемстваў. На стэндзе — поўны асартымэнт прадукцыі віцебскага камбінату «Віцьба» (яна ўжо рэалізуецца на рынку Польшчы, бо мае неабходныя сэртыфікаты). Акрамя гэтага, на выставе паказаная прадукцыя Полацкага бровару, Глыбоцкага кансэрвавага заводу й Віцебскага лікёра-гарэлачнага заводу з рэдкім асартымэнтам.

«Самі палякі пацьвярджаюць, што нашыя, здаецца, звычайныя агародніннья кансэрвы больш якасныя й смачныя за польскія, — кажа намесьнік гендырэктара холдынгу Антон Савуль. — Мы адстаём у пляне ўпакоўкі — гэта па-першае. Але галоўнае — нашыя прадпрыемствы яшчэ ня маюць сэртыфікатаў якасьці ІСО-9000. І яшчэ адна зь перашкодаў — цана. Цана нашай прадукцыі вышэйшая, чым у палякаў, таму што ў Польшчы больш разьвітая вытворчасьць сыравіны, у гэтым выпадку — агародніны».

Вялікая частка прадукцыі «Віцебскхарчпраму» пастаўляецца ў Расею. У прыватнасьці, аж 70% прадукцыі Глыбоцкага кансэрвавага заводу адгружаецца на Ўсход.

На кірмашы ў Познані свой інфармацыйны стэнд мела і Польска-беларуская гандлёва-прамысловая палата. Дырэктарка яе менскага прадстаўніцтва Людміла Касьцюковіч кажа: «Сёлета кірмаш «Polagra» вельмі прадстаўнічы на фоне 2-3 апошніх гадоў. Наш стэнд знаходзіцца ў 17-м павільёне — гэта, можа, не галоўны павільён, аднак тая колькасьць людзей, якія рэагуюць на надпіс «Польска-беларуская гандлёва-прамысловая палата», для нас — прыемная нечаканасьць. Пачынаючы ад 9-й раніцы, няма хвіліны, каб за нашым столікам не было людзей, якія цікавяцца тым, як увайсьці на беларускі рынак, як знайсьці партнэраў, як заснаваць у нас фірму».

**Валеры Саўко,**
**Беларуская служба**
**Польскага радыё**

# Модная птушка Кіпель

Вітаўт Кіпель прыехаў у Беларусь зь Нью-Ёрку на прэзэнтацыю кнігі «Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе», якую ён напісаў разам з жонкай Зорай. Прэзэнтацыя адбылася ў пятніцу 26 верасьня ў бібліятэцы Дому літаратара.

Распачалася яна сьпевам сурмы Ўладзімера Пузыні. Ахвотных «паглядзець на Кіпеля» было так многа, што сядзячых месцаў у бібліятэцы на ўсіх не хапіла: многім давялося стаяць усе тры гадзіны. Зрэшты, наведнікі гэтым асабліва не пераймаліся: нехта прысеў на падлогу, частка, утварыўшы асобныя купкі, абмяркоўвала свае справы.

Сам спадар Вітаўт нагадваў экзатычную драпежную птушку: арліны профіль, кароткі «вожык» валасоў... Гэткі амэрыканскі self-made-man, увасобленая мара савецкіх карыкатурыстаў. Распавядаў ён шмат і цікава. Ня дзіва: на зьбіраньне матэрыялаў для даведніка пайшло сорак гадоў яго жыцьця, у тым ліку дваццаць гадоў паездак. У кніжцы ўлічаныя ўсе беларускія эміграцкія выданьні ад XIX ст. Адных пэрыёдыкаў там згадваецца 422. Кніжна-часопісны збор сям'і Кіпеляў займаў 147 скрыняў. Цяпер ён перададзены Нью-Ёрскай публічнай бібліятэцы. «Калі перадаеш кнігі проста так, дык бібліятэка мае права рабіць зь імі што захоча. А мы ўтварылі спэцыяльную фундацыю ў 25 тыс. даляраў на захаваньне нашага збору, каб паставіць свае ўмовы. Бібліятэка будзе клапаціцца пра выданьні, і ўвесь збор з часам мае быць сьфільмаваны і копіі перададзеныя некалькім бібліятэкам у Беларусі», — паведаміў В.Кіпель.

Складальнікі па магчымасьці расшыфравалі псэўданімы, пад якімі друкаваліся эмігранты. («Нашай мэтай было захаваць інтэлектуальны высілак людзей», — патлумачыў сп.Вітаўт.)


АРЦЁМ ЛЯВА

Вітаўт Кіпель, ягоная дачка юрыстка Алеся Кіпель (зьлева) і Тацяна Караткевіч у рэдакцыі «НН»

На вечарыне выступалі людзі спрэс славутыя: прафэсар Адам Мальдзіс, былы міністар замежных справаў Пятро Краўчанка, архівіст Віталь Скалабан ды інш. У зале былі заўважаныя таксама Радзім Гарэцкі, Вінцук Вячорка, Анатоль Сідарэвіч, Яўген Лецка. Уладзімер Арлоў падараваў В.Кіпелю кнігу «Краіна Беларусь»: адзін асобнік ён ужо дасылаў у Нью-Ёрк, але той «прысабечылі» Кіпелевы ўнукі. Старшыня Беларускага ПЭН-цэнтру Лявон Баршчэўскі падараваў сваю кнігу «Літаратура ад старажытнасьці да пачатку эпохі рамантызму»: «Арлоў падарыў кнігу, дзе распавядаецца пра беларусаў ад аўстралапітэкаў да сёньняшніх дзён, а я дару кнігу пра беларускую літаратуру ад эгіпэцкіх тэкстаў».

Ад падарункаў перайшлі да прызнаньняў. Народны паэт Ніл Гілевіч прызнаўся, што ў 1966 г. падпісаў зварот «Ня вам беларусамі звацца», скіраваны да супрацоўнікаў Беларускай службы радыё «Свабода». Згадцы пра гэты зварот і эміграцкаму водгуку на яго знайшлося месца на старонках кіпелеўскага даведніка. «Прыйшоў да мяне камісарысты на той час Бураўкін і сказаў: «Падпішы, таварыш Гілевіч». Тыя беларусы з радыё «Свабода» за некалькі дзён да таго мае вершы пахвалілі. За што мне было сварыцца на іх? Яны ж добрую справу зрабілі для беларускай паэзіі… Але не падпісаць я ня мог, пагатоў пад зваротам стаяў ужо подпіс Васіля Быкава», — распавёў Ніл Сымонавіч.

Старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў казаў пра дасягненьні сваёй арганізацыі ва ўздыме прэстыжу мовы: «Якраз сёньня да нас прыйшлі прадстаўнікі фірмы, якая выпускае жуйкі «Дырол», каб мы дапамаглі ім перакласьці па-беларуску надпісы на абгортках». У актыў ТБМ Трусаў занёс і яшчэ два адметныя факты. Першы: уся рэкляма «Галіны Блянкі» йдзе толькі па-беларуску нават у расейскамоўных газэтах. Прычына: ТБМ — адзіная ў сьвеце арганізацыя, якая падзякавала «Галіне Блянцы» за беларускамоўныя надпісы. Другі: з прыездам пасла Крола пасольства ЗША ў Беларусі перайшло на вядзеньне дакумэнтацыі ў дзьвюхмоўным рэжыме — на беларускай і ангельскай мовах. Раней шырока выкарыстоўвалі і расейскую.

Пры канцы вечарыны старшыня Саюзу беларускіх пісьменьнікаў Алесь Пашкевіч уручыў В.Кіпелю тры сяброўскія білеты СБП: адзін — самому сп.Вітаўту, другі — жончын (пасьмяротна), трэці — для перадачы доктару Яну Запрудніку.

А напярэдадні прэзэнтацыі, падчас сустрэчы зь сябрамі ПЭН-цэнтру, В.Кіпель паведаміў, што Беларускі інстытут навукі й мастацтва ў Нью-Ёрку падрыхтаваў да друку ангельска-беларускі слоўнік на 70 тыс. словаў. Прадстаўнікі беларускага пасольства ў ЗША асьцярожна «намацваюць»: ці пагодзіцца супрацоўнікі БІНіМу надрукаваць слоўнік у дзяржаўным выдавецтве ў Беларусі?

**Адам Воршыч**

# Ёсьць больш клопат




## Замест рэцэнзіі на кнігу Зоры і Вітаўта Кіпеляў

Кніга «Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе: Асобныя выданьні: Бібліяграфія» — шостая ў бібліяграфічнай сэрыі Беларускага інстытуту навукі й мастацтва ў Нью-Ёрку. Інстытут, які не абапіраецца на дапамогу дзяржавы і дзейнасьць якога грунтуецца на энтузіязьме паасобных людзей.

Тыя, хто выступаў на прэзэнтацыі кніжкі, не маглі ня выказаць шкадаваньня, што на сьвяце не было Зоры Кіпель. Шчырая і высокакваліфікаваная працаўніца на ніве беларускае кніжнае навукі пакінула нас, пабачыўшы толькі першую карэктуру гэтага тому. Тому, у якім апісаныя 4180 выданьняў за 1840—2003 г. Гэта толькі частка працы сужэнства Кіпеляў: на чарзе — кніга пра беларускія і беларусазнаўчыя пэрыёдыкі на Захадзе (яны згадваюцца і ў выдадзеным томе, а ў наступным будзе іх падрабязны разгляд).

Дасьледнікі зьбіралі ня толькі зьвесткі пра кнігі, брашуры, праклямацыі і пэрыёдыкі ў беларускай мове і пра Беларусь, але і самі гэтыя выданьні. Архіў Кіпеляў будзе пераховывацца ў Нью-Ёрскай публічнай бібліятэцы. Рашэньне было прынятае з улікам цяперашніх рэаліяў у Беларусі. Ня толькі палітычных. Прэзэнтацыя адбывалася ў бібліятэцы Саюзу пісьменьнікаў. Гэтае багатае кнігасховішча цяпер не працуе, бо ў СБП няма сродкаў на заробак бібліятэкару і набыцьцё новых выданьняў. Лёс кнігасховішча не турбуе і дзяржаву, якая зь лёгкаю душою пайшла на ліквідацыю бібліятэкаў у рэдакцыі «ЛіМу» (яна была даведкаваю бібліятэкаю і для літаратурных часопісаў), у выдавецтве «Мастацкая літаратура» і г.д.

Тое, што з гікам будуецца новы гмах Нацыянальнае бібліятэкі, не павінна натхняць дзеячоў культуры. Дасьвечаныя людзі кажуць: будаўніцтва новага памяшканьня для бібліятэкі распачатае таму, што ў цяперашніх будынках маюць рызьмясьціць бюракратычныя ўстановы. Тым часам вострая патрэба маецца не ў будаўніцтве новага гмаху, а ў ратаваньні таго, што ёсьць у старых будынках.

Я адчуваю сябе барбарам, калі бяру ў рукі падшыўку «Нашае Нівы» ці «Гоману». Знаўцы кажуць, што за мяжой гэткія старыя газэты даюць на рукі толькі вузкаму колу карыстальнікаў, для астатніх ёсьць мікрафільмы і копіі. Наша дзяржава адмовілася рабіць факсымільныя выданьне «Нашае Нівы». Цяпер яго ажыцьцяўляюць прыватныя людзі й інстытуцыі. А тым часам страшна браць у рукі «Звязду» ці газэту «Рабочий». Якасьць савецкае паперы 1920-30-х такая, што падчас гартаньня газэтніх палосы самі пераломваюцца, зь іх сыплецца парахно. Копіяў і мікрафільмаў няма і не прадбачыцца, а газэты тым часам нішчацца. Лепшая якасьць паперы, на якой друкавалі заходнебеларускія газэты, але іх таксама трэба ратаваць — ад сьвятла, ад пальцаў карыстальнікаў.

З жахам глядзіш, як абтрапаліся старыя бібліяграфічныя выданьні, як рассыпаюцца малатыражныя, кепска склееныя кніжкі. І думаеш: ужо пара б перавыдаць, дапоўніўшы, славуты каталёг «Кніга Беларусі: 1517—1917», няблага было б пачаць працу над папраўленым і дапоўненым выданьнем біябібліяграфічнага слоўніка «Беларускія пісьменьнікі», варта было б перавыдаць у друкарні працу М.Васілеўскай «Беларусь у друку XVI ст.: Бібліяграфічны паказальнік на замежных мовах». І падвярстаць да яе паказальнікі тае ж аўтаркі, датычныя беларусікі XVII і XVIII ст.

Шмат чаго трэ было б выдаць і перавыдаць, капіяваць і мікрафільмаваць. Але ў дзяржавы ёсьць больш важны клопат, чым культура. Праведзеньне адзіных палітдзён ды змаганьне з навучэнцамі гуманітарнага ліцэю, напрыклад. І дзякуй Богу, што ёсьць энтузіясты кніжнае справы д-р Вітаўт Кіпель, д-р Янка Запруднік, д-р Юры Туронак, а.Аляксандар Надсан... На іх і на падобных да іх людзей спадзяваньне ў час панаваньня контркультуры на Бацькаўшчыне.

**Анатоль Сідарэвіч**

**Гэтае стагодзьдзе, мусіць, стане эпохай беларускіх археалягічных сэнсацыяў. Нават у Польшчы, дзе навукоўцы пераціраюць кожны грудочак зямлі, толькі летась адкрылі сваю Даліну цароў з драўлянымі «пірамідамі». Беларусы ж па скарбах ходзяць, на скарбах сядзяць, у скарбы садзяць бульбу і буракі.**

# Археалягічныя адкрыцьці году



Апошнія сэзоны раскопак у Беларусі былі ўраджайныя на манэтныя скарбы. Летась два знайшоў на Лучне пад Полацкам Марат Клімаў, гарадзенскі скарб XVII—XVIII ст. адкрыўся Генадзю Семенчуку. Пашанцавала і Алегу Іову ў Нясьвіжы: 2000 манэтаў-«бараціхнак». Назва — ад імя багаценькага Бараціні, які столькі грошай начаканіў для Рэчы Паспалітай, аж пачалася інфляцыя.

Сёлетні скарб №1 выявіў на Крупшчыне Вадзім Шадыра. Адкрыўся скарб якраз на Купальле. Срэбраныя скроневыя колцы (жанчыны і цяпер такія носяць, але ў вушах), бронзавыя бранзалеты, бронзавыя пранізкі ад жаночага вянка — вайнагі. У VII—VIII ст. н.э. такая біжутэрыя нямала каштавала. Прынамсі, даражэй за жыцьцё: яна была акуратна прыкапаная пад спаленымі чалавечымі астанкамі.

Гарадзішча Клішына, дзе хаваўся скарб, стаіць над возерам Сялява. Калісь гэта была паўвыспачка, але пасьля пабудовы электрастанцыі вада ўзьнялася й прытапіла сьцежку. Сёлета дабрацца да гарадзішча можна было па калена ў вадзе. А бывала, Шадыра і яго каманда на чаўнах дабіраліся да раскопу.

Па шчыльнасьці знаходак гарадзішча ня мае аналягаў ва Ўсходняй Эўропе. Капаюць яго ўжо пяць гадоў, а працы — яшчэ на дзесяць. Самыя старыя рэчы на Клішыне датуюцца каменным векам (сёлета знайшлі касьцяны гарпун, якому дзесяць тысяч гадоў). Ад эпохі бронзы ў Клішыне засталося пахаваньне чалавека. Клапатлівыя сваякі паклалі яму «ў дарогу» навостраную бронзавую сякерку. Дагэтуль вострая — рэжа паперу толькі так. Яшчэ адзін клішынскі сюрпрыз — берасьцяны посуд жалезнага веку. У Беларусі аналягаў ня мае. Бяроста не згніла, бо была крыху абгарэлая ў полымі забытай міжплемяннай вайны.

Трапляюцца і загадкі. Напрыклад, сотня сьвідраваных касьцяных пласьцінаў з скабаў жывёлы, знойдзеныя ў яме-ахвярніку. «Мо якія амулеты, але аналягаў не ўдалося знайсьці ні ў Беларусі, ні на сумежных тэрыторыях», — кажа Шадыра.

## Спражка Астэрыкса

«Невядомай пароды зьвер» археолягам сустракаецца часта. Таму на раскопе можна чуць такія размовы: «Выкапалі хрэн ведае што: адзін кажа — наканечнік стралы, другі кажа — востраканечнік, а выявіцца, што гэта корак ад бурдзюка»... Навукоўцы доўга часалі патыліцу над прадметам, знойдзеным у сярэдзіне 90-х на Піншчыне. Пасьля зірнулі ў замежныя каталёгі і ахнулі: гэта спражка, зробленая на поўначы Галіі ў I—II ст. н.э. «На той час агульнаэўрапейскай культурнай прасторы не было, агульнай моды таксама. Значыць, спражка патрапіла сюды разам з носьбітам», — лічыць археоляг Вадзім Белявец. Так і ўяўляеш сабе таго носьбіта — легіянэра-кантрактніка з доўгімі вусамі і вогненна-рудымі косамі. Шукаў, відаць, мора Герадота, а знайшоў вабную паляшучку і забыўся пра сваю Галію.



## Шукаю вікінга з жонкай

Яшчэ адно прывітаньне з Заходняй Эўропы адкапалі нядаўна на Браслаўшчыне. Гэта наканечнік дзіды з гатычным («стральчатым») арнамэнтам, выкаваны ў Францкай дзяржаве. У Беларусі такіх толькі чатыры, а ва ўсім сьвеце — блізу двух дзясяткаў (знаходзілі іх на ўзьбярэжжы Швэцыі, Нарвэгіі, пад расейскім Ноўгарадам). Праўда, скандынаўскія навукоўцы даводзяць, што такія наканечнікі рабілі і вікінгі, «зьдзіраючы» з францкіх узораў.

Археоляг Сяргей Дзярновіч пэўны, што паўночныя вояры прыплывалі да нас ня толькі гандляваць, рабаваць і кіраваць. Але каб пераканацца, што вікінгі заставаліся ў Беларусі на ПМЖ, трэба знайсьці ўпрыгожаньні іх жонак. «Я спадзяюся выявіць на Браслаўшчыне разам з раўнаплечнымі (на здымку вышэй) й скарлупінападобныя фібулы, — кажа навуковец. — Яны былі часткай вопраткі, якую насілі толькі скандынаўкі. Знойдзем — зможам казаць, што тут былі цэлыя паселішчы вікінгаў. Каля Гнёздава (Смаленшчына) і Дзьвінску такія фібулы трапляліся».

## Апошняя цытадэль

Праз Скандынавію трапіў у Полацак і меч X ст. з кляймом «Ульфрыхт», зробленым майстрам-франкам. Знайшлі яго будаўнікі, капаючы катляван «Шкловалакна». Старыя гарады хаваюць яшчэ мноства сэнсацыяў. Асаблівы археалягічны шык — знайсьці данжон, вежу-сэрца цытадэлі, дзе вояры трымалі апошнюю абарону. Адзіны цалкам ацалелы да нашых дзён — Камянецкая вежа — стаўся ўжо сымбалем дзяржавы. «У Полацку былі два данжоны, у Ніжнім і Верхнім замках, — кажа археоляг Сяргей Тарасаў. — Той, што быў на Верхнім, разбурылі ў 1910 г. падчас будаўніцтва больніцы — да яго не дакапаешся. На Ніжнім замку знайсьці можна». А ў Амсьціславе данжон быў драўляны — яго ўжо адшукалі. Аналягічных у іншых гарадах пакуль ня выяўлена.

## Лябірынты

Сёлета перад Днём беларускага пісьменства полацкі бульдазэрыст раскапаў на тэрыторыі езуіцкай акадэміі старадаўнія падземныя камунікацыі. На жаль, гэта не ўваход у лябірынты Ластоўскага, а толькі вадавод.

Паданьні пра лёхі пад замкамі і цэрквамі перадаюцца праз пакаленьні. Нясьвіскія кабеты сур'ёзна распавядаюць, што з Радзівілаўскага замку йдзе ход аж да самай Вільні і ў ім схаваныя дванаццаць залатых апосталаў. А дасьледчыца Ірына Ганецкая адшукала «лябірынты» ў Глуску. Гэта самы доўгі на сёньня дасьледаваны падземны ход — 17 мэтраў. Далей завал. І зьверху не адкапаеш: ход ідзе пад футбольным полем. Калідор пачынаўся ля вежы-брамы Глускага замку, а пасьля падвойваўся — вёў да рэчкі й да касьцёлу. (Сяргей Грахоўскі згадваў, як малым лазіў у той лёх.)

Знайшлі ход выпадкова ў занядбаным сутарэньні, дзе ў 60-я быў склад. Ганецкая заўважыла жалезную завесу, на якой некалі віселі дзьверы. «Яна так і тырчала са сьцены. Дзьверы ж даўно згнілі. Калі мы пайшлі па тым ходзе, дык пабачылі яшчэ адну завесу: ход перакрываўся некалькімі дзьвярыма», — распавядае дасьледчыца. Блукаць па лябі-



**Вельмі рэдкая знаходка — наканечнікі дзідаў з гатычным арнамэнтам.**



**Мікола Крывальцэвіч з матэрыяльным сьведчаньнем добрага апэтыту нашых продкаў. У версе старонкі — меч з кляймом «Ульфрыхт» знайшоў сьціплы экскаватаршчык**

АРХЕАЛЯГІЗМЫ

### Усіх пакладу

Начальнік раскопу падводзіць да яго студэнтаў-практыкантаў і тлумачыць:

— Вось тут для вас усіх выкапаная яма.

### Косткі Палікарповіча

Археоляг Канстанцін Палікарповіч раскопваў могільнік. Ведама, курганы, магілы — значыць, шмат чалавечых костак. Каб не паблытаць, археоляг акуратна расклаў іх па скрынках і падпісаў: «Косткі Палікарповіча».

### Яна ў мяне

Выкладчык чытае лекцыю: «...падчас раскопак была выяўленая ўнікальная срэбная лыжачка... Заўтра я вам з дому прынясу паказаць».

рынтах было страшнавата: ідзеш сагнуўшыся (калідор у паўтара мэтра вышынёй), мацаеш каменныя сьцены. Ішлі-ішлі так і трапілі ў «тупік». Але гэта была тонкая перагародка ў адзін камень.

Ганецкая лічыць, што лёхі мусяць быць і ў Заслаўі: «Там такога ж тыпу замак, як у Глуску, і ёсьць сьляды ходу паміж бастыёнам і брамай». Для археолягаў глускае адкрыцьцё было неспадзяваным. Мясцовыя ж людзі паставіліся да яго спакойна — нібы так і мае быць. Мо варта даць веры і нясьвіскім кабетам?

## Прага пад Петрыкавам

Дасьледчыца Валянціна Віргей адкрыла ў навакольлі Петрыкава гарадзішча аднае зь першых славянскіх культураў — праскай. Пяць паўзямлянкавых жытлаў. Падлога выкапаная на 0,6—1 м у зямлю. Зьверху дах. Ацяпленьне — адкрыты агмень. Вады і электрычнасьці няма. У чым сэнсацыя? «Як вы не разумееце! Гэта значыць, што менавіта на тэрыторыі Беларускага Палесься славяне вылучыліся з агульнага індаэўрапейскага масіву! — кажа спн.Валянціна. — Анідзе ў Эўропе няма цэлага «праскага» паселішча — толькі сьляды пад больш позьнімі напластаваньнямі».

## Стаянкі без паркоўкі

З замілаваньнем паглядаюць археолягі на неабсяжныя балоты Палесься. У торфе, без доступу паветра, лепей захоўваюцца драўляныя, касьцяныя рэчы. Палякі гэтак адкрылі ў багне вялізнае Біскупінскае гарадзішча. Нашыя археолягі знаходзілі на возеры Вячэры (Любаншчына) старажытныя малюнкі. Адшукалі птушыную костку, на якой мэзалітычны мастак надрапаў выяву лася. Нэалітычны ж прапраўнук творцы ласямі цікавіўся з гастранамічнага боку: стылізаваныя чалавечыя фігуркі ён выразаў на ласінай косьцы.

Найдаўнейшыя стаянкі першабытных людзей у Беларусі — Бердыж і Юравічы — таксама на Гомельшчыне. Але гэта ня значыць, што засяленьне краіны пачыналася адтуль, папросту Гомельшчына лепей дасьледаваная. Мікола Крывальцэвіч лічыць, што стаянкі таго самага часу, калі не старэйшыя, можна знайсьці на захадзе, у басэйне Бугу і яго прытокаў — Мухаўца і Лясной. Раскопкі на беразе Бугу арганізаваць складана, бо ўсё яго ўзьбярэжжа — памежная зона. А В.Белявец шукае на Пабужжы сьляды готаў, якія ў часе Вялікага перасяленьня народаў двойчы пракаціліся праз Беларусь. Гоцкія старажытнасьці — вялікая рэдкасьць для Ўсходняй Эўропы. Раскапаны ямчэ за саветамі гоцкі могільнік у Берасьці цалкам паехаў у Эрмітаж. Готы даліся ў знакі нашым балцкім суседзям — літоўцы дагэтуль называюць беларусаў «гудамі». Нам у спадчыну ваяўнічыя германцы пакінулі слова «хата» («hut» — часовы будынак) ды дзяржаўную арганізацыю, якая за тысячагодзьдзі мала зьмянілася. Доказ — дачны пасёлак МУС на ўнікальным Банцараўскім гарадзішчы. Цікавы аб’ект для археолягаў-нашчадкаў.

## Раскопкі з самалёта

Яшчэ адзін пэрспэктыўны кірунак — археалёгія... паветраная. Расьліннае покрыва ў абжытых і неабжытых чалавекам мясцовасьцях неаднолькавае. І на аэрафатаздымках гэта добра відаць. «Можна вызначыць межы паселішчаў і нават палёў, якія апрацоўвалі хоць бы і ў жалезным веку. Ангельскія археолягі так і робяць», — кажа С.Тарасаў. Тэрыторыя Беларусі фатаграфуецца пэрыядычна, матэрыялы трапляюць у Камітэт па зямельных рэсурсах, геадэзіі ды картаграфіі пры Саўміне. Атрымаць гэтыя матэрыялы ня так і складана, трэба толькі спэцыяліст, які б здымкі расчытваў.

## Стоўнгендж над Янавам

Наведаўшы раскопкі, якія ў 70-я ладзіў Міхась Ткачоў, бард Уладзімер Высоцкі напісаў песьню пра археоляга, які знайшоў «устаўныя сківіцы памерам з самагонны апарат». Знаходкі такіх габарытаў — зусім не рэкорд. Асабліва калі гаворка йдзе пра мэгаліты — спаруды зь вялізных камянёў. Археоляг Эдвард Зайкоўскі выявіў ля возера Янава пад Полацкам пахавальнае збудаваньне зь велічэзных каменных плітаў, што ляжаць на зямлі літарай «П». «Беларускі Стоўнгендж» — частка Бількуніцкага комплексу, дзе нашы дахрысьціянскія продкі маліліся. Недалёка ад пахаваньня выявілі тры паганскія ахвярнікі, два стоды. «Знойдзенае Зайкоўскім — пяцідзясятая частка ад таго, што там ёсьць, — кажа С.Тарасаў. — Там сустракаюцца цалкам неверагодныя зьявы. Уявіце сабе пагорак вышынёй мэтраў 20—30, зь вяршыні якога б’юць крыніцы. А побач ляжаць камяні з насечкамі». Нашыя археалягічныя скарбы — як тыя крыніцы на вяршыні. Зямля імі поўніцца.



На здымку між калёнкамі: скарлупінападобная фібула, якія насілі толькі скандынаўкі.



Вадзім Шадыра знайшоў старажытныя ўпрыгожаньні з срэбра і бронзы менавіта на Купальле.

**Аркадзь Шанскі,**
**фота Андрэя Лянкевіча**



Сяргей Тарасаў няблага разьбіраецца ў паветранай археалёгіі.

# Трыццаць навукоўцаў і тысяча копараў



Валянціна Віргей знайшла пад Петрыкавам унікальнае гарадзішча.

Археалёгія як духавенства: падзяляецца на «белую» і «чорную». Прычым другая палова значна пераважае і вызначаецца зусім не манаскімі паводзінамі. Калі прафэсійных археолягаў у Беларусі ўсяго з трыццаць (асьпірантура пры НАН штогод выпускае двух спэцыялістаў), дык «чорных» — сотні. Можна выдзеліць чатыры катэгорыі тых «копараў». Першая — цікаўныя аматары старажытнасьцяў. Гэтыя моцна ня шкодзяць. Другая — шукальнікі антыкварыяту. Тут трапляюцца як «бізнэсоўцы», што жывуць з пошукаў і продажу старажытнасьцяў, так і калекцыянэры. Для трэціх копарства — модная форма адпачынку. Багатыя людзі купляюць апаратуру, капаюць абы-як абы-дзе. Гэткія аматары неяк прыехалі да навукоўцаў на машыне з «навернутай» апаратурай: «Падкажыце, дзе зрабіць пробы: у нас яўна золата». Археолягі доўга сьмяяліся: машына была даверху наладаваная палявым шпатам з блёстачкамі сьлюды... Рабаўнікі археалягічных помнікаў трапляюць у чацьвертую групу. Гэта начытаныя й добра абазнаныя людзі. Яны ведаюць, дзе і што шукаць.

У Беларусі праблема копараў не такая вострая, як у Расеі ці Ўкраіне. Па прычарнаморскіх стэпах, устаўленых скіфскімі ды сармацкімі валатоўкамі, «чорныя» езьдзяць з збройнай аховай ды адстрэльваюцца ад міліцыі, калі тая перашкаджае.

На ўсходзе Беларусі дзейнічаюць цэлыя чорныя археалягічныя рынкі. Пра гомельскі навукоўцы паведамлялі міліцыі, але безвынікова. Ёсьць падпольны рынак і ў Менску: В.Шадыра сьцьвярджае, што бачыў археалягічныя артэфакты ў клюбе калекцыянэраў у Палацы культуры чыгуначнікаў.

Але большая частка тавару ідзе на ўсход — кудысьці пад Санкт-Пецярбург, на найбольшы чорны рынак археолягаў. Дый расейскія «копары» наведваюць Беларусь. Межы адкрытыя, таму на Магілёўшчыне і Гомельшчыне нярэдка можна спаткаць «гастралёраў».

Цэны на знойдзеныя рэчы істотна вагаюцца: усё залежыць ад таго, ці ўсьведамляе гаспадар, колькі можа каштаваць ягоная знаходка. Якую фібулу могуць прадаць і за тысячу рублёў, і за 50 даляраў. Рынкавы ж кошт зазвычай сягае сотняў і тысячаў.

**АШ**



Ірына Ганецкая адкрыла ў Глуску самы доўгі падземны ход.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

# Зубрам трэба сьвежая кроў

Паведамленьне, што зубры-самцы ў Белавежы пакутуюць на цяжкае запаленьне пэніса і ня могуць размнажацца, зьмешчанае ў апошнім нумары штотыднёвіка «Der Spiegel».

Нямецкія навукоўцы схіляюцца да таго, што ўзбуджальнікам моцнага запаленьня пэніса ў зуброў, калі жывёліны ня могуць ня толькі размнажацца, але і хадзіць, ёсьць бактэрыі. Прыкладна 22% сярод іх складаюць сьпірахеты — гэта ўзбуджальнікі сыфілісу.

Вядучы навуковы супрацоўнік Беларускага інстытуту вэтэрынарыі Пятро Красачка кажа: «СНІДу ў іх няма. Проста ёсьць пэўныя імунныя пашкоджаньні. Яны зьвязаныя з колішнім інцэстам. Гадоў пяць таму назіралася гэтак званая полавая дэпрэсія пры скрыжоўваньні. Былі выпадкі, калі даходзіла да нэкрозу полавых органаў. Пакутавалі на падобнае захворваньне нават вельмі маладыя самцы — год, паўтара. Увогуле зубр жыве ў сярэднім 20 гадоў і размнажаецца дзесьці да 14 гадоў.

Што да дасьледаваньня беларускіх зуброў на мікрафлёру, то тут сапраўды былі знойдзеныя і хламідыі, і мікаплязмы, і сьпірахеты. Зубры кантактуюць з каровамі, а гэтыя жывёлы маюць падобныя праблемы. Аднак гэта ня значыць, што зубры могуць ад гэтага захварэць. Часам бактэрыі могуць жыць у арганізьме без усялякіх наступстваў усё жыцьцё.

Мы расьсялілі зуброў па ўсёй Беларусі — у Прыпяцкім запаведніку, Палескім, Налібоках. Зубры атрымліваюць добрае сілкаваньне. Ведаеце, займаюцца сэксам, добра размнажаюцца і так, як раней, не хварэюць».

**Паводле радыё «Свабода»**

# ...ператворацца ў стэп



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

**Праз паўстагодзьдзя замест ільну ды бульбы беларусы будуць садзіць сланечнікі й кукурузу.**

**Працяг са старонкі 1.**

Павялічыцца канцэнтрацыя радыенуклідаў у рэках і азёрах. Зьменшыцца ўрадлівасьць глебаў. Балоты пачнуць зарастаць. Значна зьменшацца ўраджаі бульбы, ільну і збожжавых. Павелічэньне ўраджайнасьці магчымае толькі на Паазер'і.

З катастрафічных зьяваў найбольш імаверным у Беларусі паводкі. Асабліва калі ўлічыць моцныя паводкі 1845 і 1931 г. Разам з гэтым, поўдню Беларусі пагражае апустыньваньне.

З аднаго боку, зьменшацца выдаткі на ацяпленьне. Паводле прагнозаў, да сярэдзіны гэтага стагодзьдзя ацяпляльны пэрыяд скароціцца на адзін месяц. Цяпер нашы памяшканьні ацяпляюцца пры паніжэньні сярэднясуткавай тэмпэратуры да 8°С. У параўнаньні з 1968 г. ацяпляльны сэзон ужо зьменшыўся на 6—9 дзён (раней сканчаецца). Зь іншага боку, разам з пацяпленьнем павялічацца выдаткі на кандыцыяваньне паветра ўлетку.

Найцяжэй давядзецца сельскай гаспадарцы. На поўдні Беларусі можа ўвогуле паўстаць пытаньне аб яе рэнтабэльнасьці. Ва ўсякім разе, спатрэбяцца дарагія меры на адаптацыю лёгкіх і паўлёгкіх глебаў, а таксама вялікія выдаткі на штучнае арашэньне. На Палесьсі ўжо цяпер трэба прыкідваць сыстэму нерэгулярнага арашэньня (паўторнае выкарыстаньне дрэнажных водаў, рэгуляваньне сьцёку, нават стварэньне падземных вадасховішчаў). Навукоўцы кажуць, што мэтазгодна будзе пашырыць пасевы кукурузы, проса, соі, цукровых буракоў. Раяць актыўна культываваць і новыя маразастойкія культуры, перастрахоўвацца ад наступстваў засухаў. Іншае вырашэньне — увогуле вывесьці неўрадлівыя землі на поўдні краіны зь сельскагаспадарчага ўжытку і засеяць іх лесам.

На кліматычныя зьмены можна рэагаваць двума спосабамі: адаптавацца да новых умоваў альбо запавольваць пацяпленьне, зьмяншаючы выкіды парніковых газаў і саджаючы лес. Спыніць канцэнтраваньне газаў амаль немагчыма. Ні Кітай, ні ЗША, на долю якіх прыпадае 38% шкодных выкідаў, не зьбіраюцца далучацца да Кіёцкага пратаколу, што рэгулюе зьмяншэньне канцэнтрацыі парніковых газаў. Вагаецца і Расея. Зрэшты, у нашай краіне ўзровень выкідаў, паводле афіцыйных зьвестак, ад 1990 г. не павялічыўся — як і патрабуюць міжнародныя забавязаньні. Таму ў найбліжэйшыя гады рэакцыя на кліматычныя зьмены «ня будзе выходзіць за рамкі дзеяньняў аўтаномнага рэагаваньня». Прасьцей кажучы: пацяплее — палезем на пальмы, а пакуль тое — садзім бульбу і падымаем лён.

**Вераніка Дзядок**

# Чарнобыльскія сосны

## радыяцыі не баяцца



Хвоі, што растуць у лясах вакол Чарнобыльскай электрастанцыі, зьмянілі свае ДНК. Цяпер нават вялікія дозы апрамяненьня ім ня шкодзяць. Дрэвы прыстасаваліся да жыцьця ў асяродзьдзі, дзе выпала вялікая колькасьць радыеактыўных спалучэньняў. Андрэй Архіпаў ды Мікалай Кучма, навукоўцы з Чарнобыльскага цэнтру міжнародных дасьледаваньняў, і Вольга Кавальчук, біёляг зь Летбрыдзкага ўнівэрсытэту (Канада), ужо некалькі гадоў дасьледуюць экалягічныя вынікі аварыі.

### Што не заб'е, тое ўмацуе

Хваіны наўпобліз месца выбуху і на дарозе радыеактыўнага ветру ля рэактара ў большасьці загінулі. Тым жа, што расьлі наводдаль, пашчасьціла больш. Яны выжылі, хоць і атрымалі вялікія дозы апрамяненьня, хоць і былі абсыпаныя радыеактыўнымі ападкамі, зь якіх самы небясьпечны — цэзій-137. Дрэвы мусілі прыстасавацца да новых умоваў — зьмяніць свае ДНК такім чынам, каб павышаны радыяцыйны фон успрымаўся як норма. Але прырода павяла іх іншым шляхам. Хвоі выжылі ня дзякуючы зьменам у канкрэтных генах, што адказваюць за павелічэньне ўстойлівасьці перад апрамяненьнем. Дрэвы «ўключылі» мэханізмы, якія бароняць увесь генэтычны матэрыял ад пашкоджаньня. Да таго ж зрабілі гэта хвоі імгненна, дзякуючы чаму маглі зносіць дозы радыяцыі, шматкроць большыя за «ліміт». То бок прыстасаваліся максымальна. «Што мяне не заб'е, тое ўмацуе».

### Што такое мэтылацыя?

Якая ж перамена адбылася ў хваінах і зрабіла іх такімі «волатамі»? Кавальчук і яе калегі шукалі адказ на гэтае пытаньне некалькі гадоў.

Першы экспэрымэнт пачаўся ў 1992 г. Навукоўцы пасеялі хваінкі ў месцах, дзе пасьля аварыі быў закапаны радыеактыўны матэрыял. Там заражэньне глебы цэзіем перавышае дапушчальны ўзровень (да 1 кюры) у 4000 разоў. Але большасьць дрэўцаў ператрывалі гэта. Дасьледнікі ўзялі зь іх генэтычны матэрыял для аналізу і выявілі надзвычай высокі ўзровень мэтылацыі генаў. Мэтылацыя — гэта дапасаваньне мэтылавай групы $CH^3$, якую расьліны выкарыстоўваюць для абароны генаў, да ланцужка ДНК. Так і зрабілі хваіны, што вырасьлі на радыеактыўным грунце. Узровень мэтылацыі ў іх на траціну вышэйшы, чым у дрэўцах, што расьлі на чыстым грунце. Гэта можна назваць нават гіпэрмэтылацыяй.

Наступны экспэрымэнт адбываўся таксама наўпобліз Чарнобылю, толькі што ў лесе, які вырас да выбуху (узрост дрэваў — каля сарака гадоў). ДНК гэтых хвояў таксама былі гіпэрмэтылаваныя. Аднак гэтая ўласьцівасьць не перадаецца з пакаленьня ў пакаленьне. Дрэўцы, што вырасьлі з насеньня зьмененых хваінаў у чыстай глебе, мелі нармальны ўзровень мэтылацыі.

### Хвоі здольныя, а людзі?

Ці ёсьць гэты мэханізм прыстасаваньня ўнівэрсальным? Даўно было вядома, што некаторыя бактэрыі не баяцца дозаў апрамяненьня, забойчых для іншых стварэньняў. Дасьледаваньні, зладжаныя навукоўцамі, сьведчаць, што ня толькі аднаклеткавыя арганізмы, але й высокаразьвітыя расьліны могуць бараніцца ад інтэнсіўнага апрамяненьня. Можа, такая здольнасьць зьявіцца ў жывёлаў і людзей? Назіраньні за іх генэтычнымі зьменамі пад уплывам радыяцыі толькі пачаліся.

**МХ; «The New Scientist»**

# Бэтонны Чарадзей

**Скульптурны пленэр «Абуджэньне-2003» адбыўся ў Воршы. Празь фінансавыя праблемы ён ня быў такім прадстаўнічым, як леташні, прысьвечаны Ўладзіміру Караткевічу. Тым ня менш, зробленыя сёлета скульптуры з каменю ўпрыгожылі замчышча, а драўляныя («Чаканьне» Юр'я Палякова з Талачына і «Беларуская мадонна» аршанкі Натальлі Макаранкавай) — экспазыцыю этнаграфічнага музэю «Млын».**

Першы ў Беларусі «помнік у паветры» зроблены Аляксеем Сарокіным (Тальяці, Расея). Бэтонны «Паўмесяц сьпіць» (на здымку) вагою амаль у тры цэнтнэры ўмацаваны на чатырохмэтровым мэталёвым шасьце.



Прыцягвае ўвагу й помнік Усяславу Чарадзею, пастаўлены на штучным востраве насярод рэчкі Аршыцы, насупраць замчышча. Яго зь белага бэтону стварыў арт-куратар пленэру Ўладзімер Піпін (Менск), у мінулым выкладчык аршанскай дзіцячай мастацкай вучэльні. Першы ў краіне помнік легендарнаму князю зьявіўся ў горадзе на Дняпры невыпадкова. Менавіта тут Усяслаў з малымі сынамі быў падступна захоплены ў палон Яраславічамі.

Алегарычная выява ваўка з крыламі дае вялікую прастору для фантазіі. Рэалістычную ж гіпсавую выяву Ўсяслава У.Піпін падараваў пару гадоў таму аршанскай цэнтральнай бібліятэцы на 100-годзьдзе. Пабачыць скульптуру можна ў агульнай чытальнай залі. Праўда, праз пакаёвыя расьліны дзяржаньне мяча, на якое абапіраецца князь, не заўважнае. Таму некаторыя чытачы думаюць, што гэта асьветнік і друкар XVII ст. Сьпірыдон Собаль.

Застаецца спадзявацца, што з часам славутых асобаў айчыннай гісторыі і культуры будуць рабіць з больш даўгавечных і трывалых матэрыялаў. Яны таго вартыя.

**Віктар Лютынскі, Ворша**

# Някляеў з раманчыкам

Някляеў У. Лабух. Раманчык. — Менск, 2003.

Раманчык Някляева нязручна чытаць у грамадзкім транспарце: апаноўвае здаровы гучны сьмех і ня менш здаровая эрэкцыя. Але кніжка не маскультавая — складанаватая. Пра лабухаў (рэстаранна-ВІАгравых музыкантаў) у нас ужо пісалі — узяць хоць бы «Саксафон Чынгісхана» Зьмітра Падбярэскага. Там лабух нават болей лабаў. У Някляева ён сьпіць з жанчынамі, філязафуе, ужывае разнастайныя напоі, лязыць у больніцы, ідзе да Беларусі, а грае толькі пры канцы — затое як! Ня варта купляцца і на вясёлую алькагольна-сэксуальную аблямоўку: раманчык — пра тое, што каханьне памірае. Хоць камусьці ён падасца шпіёнскім дэтэктывам з удзелам найвышэйшага дзяржаўнага кіраўніцтва. А таму, хто адгарне старонку 181, — гатычным раманам.

Перагарнуўшы ж старонку апошнюю, узыхаеш: а так добра ўсё пачыналася! Фінальны акорд трагічна-велічны. Нават дзіўна, што такі цынічны раманьяк пакідае такое сьветлае ўражаньне.




**P.S.** Той, хто думае, што раманчык — гэта «такі маленькі раман», моцна памыляецца.

**Яўген Квач**

ДЫСКАГРАФІЯ

## Грані

Deadmarsh (p) Deathbell productions, BMAgroup, 2003

Яшчэ ўвесну ўдзельнікі гурту «Deadmarsh» паведамілі краіне аб працы над беларускамоўным альбомам. Падкрэсьлівалася, што праграма будзе збудаваная на цяжкіх музычных увасабленьнях вершаў славутых беларускіх паэтаў. Аднак, узяўшы ў рукі гатовы прадукт, давядзецца зьдзівіцца: на музыку пакладзеныя толькі вершы «Мой кут» (Ларыса Геніюш) і «De la musique avant toute chose» (назва паводле эпіграфу да вершу Максіма Багдановіча «Па-над белым пухам вішняў...»). Астатняе ж — уласна deadmarshаўская творчасьць.




Але ўражаньне ад стылёва аздобленай вокладкі-кніжыцы з тэкстамі й фота ды саміх песьняў застаецца добрае. Сем трэкаў альбому гучаць ажно 42 з капкаю хвілінаў. Усе кампазыцыі (за выняткам караценькай і пекнай інструмэнтальнай «Манолы») — сапраўдныя баляды. «Непазьбежнасьць», «Апошні жах», «У бязьлітасьці» — назвы самагаваркія і, безумоўна, адпудзяць FM-аўскіх функцыянэраў. Для іхных *дзіяметраў* гэта нефармат.

«Апошні жах» — цьвік праграмы, песьня-асэнсаваньне няміскіх трагедыяў, проста ў кавалкі разрывае сэрца. Нават Памідораў з «Крывавым сьвятам» нікне перад ёй. Не адстаюць і ўвасабленьні твораў Геніюш і Багдановіча. Многім слухачам, звыклым да вэрсіі Ігара Паліводы, апошняя кампазыцыя ня прыйдзецца даспадобы. Але з прычыны сваёй мяккасьці яна, як цьвердзяць самі музыкі, была імі абраная візытоўкай альбому. На яе ўжо зьняты кліп. (Ролік можна пабачыць на Беларускім тэлебачаньні у «Кліпабойме».) Купляйма й галасуйма! Музыкам жа парада: больш не рыфмаваць у трох песьнях альбому словы «шлях» і «жах».

## Zapaviet apošniaha starca

Znich (p) (C)&(P) BMAgroup, 2003

Праграма пачынаецца з intro «Запавет», дзе «заслужаны артыст РБ» (так на вокладцы!) Георгі Маляўскі чытае паганскі заклён. Заклёнам пачынаўся і дэбютны альбом гурту «Стары Ольса» «Келіх кола» (2001). У песьнях «Зьнічу» чуваць і традыцыйны стараольсаўскі набор інструмэнтаў — дуда, бубны, варган, колавая ліра etc. — у спалучэньні з электрагітарамі. Беларускія народныя песьні ў выкананьні калектыву пацяжэлі не на адзін кіляграм. Аматары аўтэнтыкі ці палацаўска-крывяўскіх апрацовак рызыкуюць страціць раўнавагу. З васьмі песьняў дзьве цалкам народныя (у апрацоўцы),




пяць народных напалову (аўтарская музыка + фальклёрныя тэксты) і адна поўнасьцю аўтарская. Апроч інвазіяў сола-гітараў у зыкі дуды і дудкі, калярыту песьням дадае «кактэйль Молатава»: звонкі жаночы вакал і добры мужычы рык. Альбом немагчыма слухаць без усьмешкі, пры тым што тэксты пераважна сур'ёзныя. Сур'ёзным зьяўляецца і прысьвячэньне «тым старым вяскоўцам, якія захавалі для нас старажытныя тэксты й мэлёдыі».

**Сяргей Балахонаў**

# Тузін гітоў

**З 1 кастрычніка ў Інтэрнэце пачынае працу беларускі музычны гіт-парад «Тузін гітоў». Галасуйце за ўпадабаныя песьні на www.music.fromby.net (паслухаць іх можна проста з сайту). У першую дванаццатку трапілі:**

«Устану ранкам» («Уліс»), «Журавы» («Троіца»), «Скрыпка дрыгвы» («Нэйра Дзюбель»), «Люблю» («Крамбамбуля 1S»), «Дзень без гарэлкі» (Аляксандар Памідораў), «Парай дарогу» («Partyzone»), «Курвы танчаць баль» («Ляпіс Трубяцкой»), «Сіні апэльсын» («Гарацкія»), «Шукальнікі сэнсу» («План»), «Купальская» (Сяргей Трухановіч), «Enjoy the silence» («Крама»), «Алеся-2003» («Беларускія песьняры»).

Слухайце ды выбірайце! Таксама на сайце — навіны, рэцэнзіі, фатаздымкі.

**Сяргей Будкін**

# Летапіс ад адмарозка

Павал Севярынец. — Пакаленьне Маладога Фронту. Гісторыя моладзі, народжанай у 1970—85. — Менск, 2002.

Палітычна матываваная дзейнасьць у сёньняшняй Беларусі — як начны паход па мінным полі ў завіруху. Ні грошай — ну хіба на ўручную сшытую і непераплеценую брашурку, ні пашаны — што ты сядзеў тры месяцы на Валадарцы, што чатыры дні на сэмінары, адна слава. Ні ўлады. Між тым менавіта дзёрзкай барацьбой за ўладу была палітычная дзейнасьць пакаленьня «Маладога фронту», якое натхнёна апісвае ягоны лідэр. Кніэе не стае самааналізу, якога чакаеш ад палітыка. Гэта больш летапіс і мабілізацыйная казань. Ва ўсім астатнім цікава — бо па-беларуску, бо пра палітыку і пра нас з вамі, ня раз пералічаных паймення. А таксама пра Макса Мірнага, Севу Янчэўскага, Аляксандра Старыкевіча й Віталя Супрановіча.

Найбольш апратыўна на выхад гэтай кнігі адгукнуўся орган Адміністрацыі прэзыдэнта «Беларуская думка». Калі б гэтая кніга выйшла, як у палітыкаў на Захадзе ці Ўсходзе, пад глянцавай вокладкай, трапіла б на відно ў кнігарнях.

**Сяргей Гезгала**

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Архівы на шляху XXI стагодзьдзя: гісторыя, спадчына, сучаснасьць:** Матэрыялы Другога бел.-франц. сэмінару, Менск, 8—10 лютага 2000 г. / Пад рэд. К.Козака і інш. — Менск, 2003. — 220 с. Наклад 100 ас.

**Бохан Ю. Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385—1576 гг.** — Менск: Беларусь, 2003. — 88 с.: іл. 3000 ас.

Аўтар распавядае пра розныя віды ўзбраеньня часоў ВКЛ. Для гэтага навукова-папулярнага выданьня (а зусім нядаўна выйшла манаграфія таго ж дасьледчыка) падабраныя шматлікія ілюстрацыі.

**Бугаёў Дз. Паэзія Максіма Танка.** — 2-е выд., выпраўл. і дап. — Менск: Беларуская навука, 2003. — 311 с. 3000 ас.

Кніга дапоўненая разьдзеламі пра позьні пэрыяд творчасьці М.Танка і ахоплівае ўсю спадчыну паэта. У «Цэнтральнай кнігарні», «Сьветачы», «Акадэмкнізе» й шапіку ў Акадэміі навук выданьне каштуе 1700 руб.

**Плотнікаў Б. Кароткая гісторыя беларускай мовы і мовазнаўства:** Вуч. дапам. / Акадэмія кіраваньня пры прэзыдэнту. — Менск, 2002. — 103 с. 200 ас.

**Пракаповіч І. Крыжы і камяні:** Нарысы па гісторыі Пастаўскага краю. — Маладэчна, 2003. —56 с.: іл. 500 ас.

Дагэтуль аўтар-краязнаўца дасьледаваў геаграфію і гідраніміку роднае Пастаўшчыны. Тыя працы таксама выйшлі асобнымі кніжкамі. Ягоныя ж «Крыжы» чытаюцца ня горай ад Смолічавай «Геаграфіі».

**Рублеўскі С. Азярод.** — Менск: Выд. цэнтар БДУ, 2003. — 191 с. 1000 ас.

Зборнік апавяданьняў і эсэ можна адшукаць на выставе ў ТБМ.

**Сучасная беларуская проза: Традыцыі і наватарства** / Уклад. Ул.Сіўчыкава, М.Тычыны; Прадм. М.Тычыны. — Менск: Сэр-Віт, 2003. —704 с. 3000 ас.

Новая анталёгія беларускага апавяданьня ўключае творы 47 аўтараў апошніх сарака гадоў, у тым ліку В.Быкава («Музыка»), У.Караткевіча («Сіняя-сіняя»), М.Стральцова («Смаленьне вепрука»), В.Адамчыка, Я.Брыля, Л.Вольскага. Каштуе 7000 руб.

**Там, дзе вежы Сафіі: Полаччына літаратурная:** Проза, паэзія / Уклад. Н.Гальпяровіча. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 286 с. 1500 ас.

У «Кнігарні пісьменьніка» том каштуе 6290 руб.

**Танк М. Мне пару крыл дало юнацтва:** Выбраная лірыка / Уклад. В.Рагойшы. — Менск: Мастацкая літаратура, 2003. — 479 с. — (Беларуская паэзія XX стагодзьдзя). 2500 ас.

Цана выданьня каля 5700 руб.

**Цішкін І. Віцебск: Страчаная прыгажосьць гораду**. — Віцебск: УПП «Віцебская абл. друкарня», 2002. — 48 с.: іл. 700 ас.

Аўтар каротка распавядае пра фармаваньне архітэктуры гістарычнага цэнтру Віцебску, пра асобныя помнікі дойлідства, што ўпрыгожвалі горад.

**Цішкін І. Віцебскія замкі**. — Віцебск: УПП «Віцебская абл. друкарня», 2003. — 16 с.: іл. 1000 ас.

У XIV—XVIII ст. Віцебск меў магутныя абарончыя збудаваньні. Пра архітэктурныя асаблівасьці й лёс тых замкаў сьцісла распавядаецца ў гэтай кніжачцы. Пытайце на сядзібе ТБМ.

**Тацяна Вабішчэвіч**

# Як было ў Залесьсі

Ідучы да залескага палацу Агінскіх, разумееш, што свае алеі — усе гэтыя гіганцкія зыркія жоўта-чырвоныя клёны і таполі — князь Міхал задумляў з разьлікам на бабіна лета. З надвор'ем залескаму сьвяту, што адбылося ў гэтую нядзелю, пашэнціла. Асабліва калі згадаць леташні дубар і слоту. За год у зімовым садзе маёнтку зьявілася электрычнасьць і сьціпленькая выстава з партрэтамі радзіны Міхала Клеафаса, радаводным дрэвам і макетамі палацаў. А перад фасадам «вырас» валун з гербам Агінскіх і дароўным надпісам скульптара Грушы. Сядзіць гузаком і псуе ўсю панараму. Што зробіш — дораны камень...

Бардаўска-фальклёрна-этнічны канцэрт некалькі разоў перарываўся кулінарнымі інтэрмэдыямі, што дадавала яму жывасьці. Конкурс на найлепшую канапку шчасьліва праваліўся, бо мала хто з гасьцей адважыўся выкласьці на агульны стол свае ссабойкі. Усё болей трушчылі па кутох. Тым прыемнейшыя былі выключэньні. Напрыклад, гатычны торт-ялінка, падораны віленчукамі, і кавун ад менскае фірмы «Чырвоная лінія», якая ці ня ў поўным складзе прыехала на сьвята ў Залесьсе.

Пад заслону некалькі параў станчылі палянэз. І хай сабе толькі адна пані ведала, як гэта робіцца, і ціхутка давала каманды астатнім танцорам: апляДысмэнты зарабілі. І за танец, і за сьвята.

**Цень К.**




**Паводле задумы арганізатараў, узяць удзел у касьцюмаванай дзеі мог кожны.**

IN MEMORIAM

## Падарожжа даўжынёю ў жыцьцё

Майстар сучаснае расейскае тэлекухні Леанід Парфёнаў казаў, што цяперашняя спэцыфіка тэлевяшчаньня патрабуе пошуку бяспройгрышнае эфэктнадынамічнае формы. Маўляў, ня важна, пра што ідзе гаворка: пра булёныя кубікі або пра фаварытаў Кацярыны II. Удала знойдзеная форма, абаяльнасьць вядучага — і глядач ваш. Тое правіла ў дачыненьні да экраннага даўгавечніка, «Клюбу падарожнікаў», дзейнічае з пэўнай агаворкай. У «Клюбе» была асоба ня проста вядучага, а сапраўднага гаспадара эфіру. Кажу «была», бо ў мінулы чацьвер 25 верасьня ў 9.15 памёр найстарэйшы з тэлевядучых у сьвеце Юры Сянкевіч.



З давён-даўна закладзеная дынаміка «Клюбу падарожнікаў» ніяк не стасуецца з сучаснымі патрабаваньнямі тэлевізійнае моды, асабліва ў век бязглуздых шоў і бандыцкіх тэлеразборак. Але аўтарытэт перадачы і яе вядучага быў мацнейшы за любыя «навароты» сучасных праграмаў-аднадзёнак. Глыбокі барытон Сянкевіча супакойваў, манера гіпнатызавала. Праграму глядзелі ўсе! І палітыкі, і хатнія гаспадыні, і крымінальнікі, і дзеці.

Палкоўнік Сянкевіч рыхтаваўся стаць першым касьмічным доктарам. У 1967-м бяз доўгіх разважаньняў ён, адзіны з усёй досьледнай групы, згадзіўся правесьці год на антарктычнай станцыі. Гэта было выправабаньне, зь якім Сянкевіч справіўся. Але вырашальным момантам у яго кар'еры стаўся іншы выпадак... У 1968-м, падчас прыёму ў нарвэскае каралевы, Мікіта Хрушчоў падышоў да Тура Хеердала і ці то жартам, ці то сур'ёзна прапанаваў узяць яго з сабою ў чарговую вандроўку. «Калі б Вы прыхапілі з сабою як мага больш ікры, я б вас узяў», — адказаў Хеердал. На тым і разышліся. Але дыпляматы зьмікіціслі, у чым справа: у адну з наступных вандровак Хеердал зьбіраўся запрасіць «рускага». І налета Сянкевіч увайшоў у мультынацыянальны экіпаж папіруснага чаўна «Ра».

Геаграфіі ягоных падарожжаў можна пазайздросьціць. За свае шэсьцьдзясят шэсьць гадоў Юры Сянкевіч пабачыў 130 краінаў! І куды б ні трапляў спадчынны лекар — знаходзіў супольную мову, годна трымаўся ролі госьця. За сваё жыцьцё Юры пабываў там, дзе дзясяткі мільёнаў савецкіх гледачоў мроілі быць. «Клюб» быў ня проста наглядным падручнікам геаграфіі, ён стаўся прадметам зьдзяйсьненьня, няхай і праз чорна-белую тэлескрыню, таемных авантурных жаданьняў. Гэта той рэдкі выпадак, калі створанае за саветамі вабіць нас і сёньня.

«Як толькі зьбіраюся ў чарговую экспэдыцыю, — сьмяяўся Сянкевіч, — на мяне находзіць: «Божачкі, куды я еду, дый навошта тое патрэбна? Навошта я кідаю дом, хто мяне там чакае, як там усё будзе?..» Але як толькі сядаю ў цягнік, самалёт, човен — усё як адрэзала. Мяне ахоплівае нястомная допытлівасьць…»

Няхай і на той зямлі нязьведанай, да якой вязе цябе на чаўне сівы Харон, знойдзеш ты гасьцінны прыём! Шчасьлівага плаваньня, ціхага ветру й нізкіх берагоў табе, Падарожнік.

**АМ**

## Таццяна Талстая ў беларускай экспазыцыі

**З 25 да 28 верасьня ў швэдзкім Гётэбарзе адбыўся чарговы сусьветны кніжны кірмаш.** Гэта найбуйнейшая ў Скандынавіі культурная падзея стартавала ў 1985 г. і ад пачатку лучыла кніжны кірмаш з выступамі найлепшых у сьвеце пісьменьнікаў, інтэлектуалаў, журналістаў і праваабаронцаў. Сёлета за чатыры дні на Гётэбарскім кірмашы пабывала больш за 110 тыс. наведнікаў. У цэнтры ўвагі была Польшча, якую прадстаўлялі пад сорак выдавецтваў і больш за восемдзесят вядомых і маладых польскіх пісьменьнікаў, паэтаў ды навукоўцаў.

Нашу краіну прэзэнтавала з уласнай сэмінарскай аўдыторыяй (Н03-31) і кніжным стэндам швэдзкая суполка «Беларусь» пры фінансавай падтрымцы Швэдзкага інстытуту. Беларуская праграма сэмінараў не саступала багацьцем літоўскай, эстонскай і латыскай частках, падрыхтаваным на дзяржаўным узроўні. Зь лекцыямі пра Беларусь выступілі журналіст Шэль Альбін Абрагамсан (аўтар кнігі «Беларусь: 89 міліметраў ад Эўропы»); кіраўнічка суполкі «Беларусь» у Швэцыі, папулярная фотажурналістка Марыя Шодэрбэрг; польскі пісьменьнік і падарожнік Рышард Капусьцінскі (яго кніга пра роднае места «Вандроўка ў Пінск» выйшла ў Швэцыі); гісторык Андрэй Катлярчук (прэзэнтаваў сваю кнігу «Швэды ў гісторыі і культуры беларусаў»); швэдзкі журналіст Тобіяш Люнгвал, аўтар кнігі «Кантроль, рэпартаж зь Беларусі»; кіраўнічка грамадзкай суполкі «Калегіюм» зь Пінску Надзея Аўсіевіч (з тэмаю «Сэксуальны гандаль жанчынамі: беларускі бок праблемы») і інш.

Таксама выступіла пераможца «Кубку моладзевай паэзіі», арганізаванага ў Пінску суполкай «Беларусь», 17-гадовая Вольга Панасюк. Яе вершы прагучалі па-беларуску і па-швэдзку (у перакладзе Дзьмітрыя Плакса) ды выклікалі зацікаўленьне слухачоў. У вялікай сэмінарскай залі кірмашу йшла дыскусія пра супольную беларуска-швэдзкую гісторыю. Пасьля быў беларускі фуршэт, падчас якога госьці пабачылі зробленыя спадарыняй Шодэрбэрг слайды Палесься. Беларуская экспазыцыя прытуліла і вядомую расейскую пісьменьніцу Таццяну Талстую, а таксама яе калегу з Індыі Вандану Шыву. Іх краіны ня мелі ўласных сэмінарскіх пакояў.

**АК, Стакгольм**

### Адродзіцца Таварыства беларускіх лекараў

**У ЗША вядзецца падрыхтоўка да аднаўленьня дзейнасьці Таварыства беларускіх лекараў.** Гэтая арганізацыя была ўтвораная прадстаўнікамі паваеннай хвалі эміграцыі ды ўжо даўно ня дзейнічае. Цяпер яе адраджаюць новыя беларускія эмігранты і некалькі сыноў эмігрантаў старых. Чакаецца, што ў гэтай арганізацыі будзе свой сайт у Інтэрнэце.

**Барыс Данілюк, ЗША**

• З УСЁЙ КРАІНЫ •

### Пажар у Гудагаі

**Амаль два з паловай мільёны рублёў каштавала свавольства 68-гадовага пэнсіянэра сельгаскаапэратыву «Гудагай».** Вечарам той ці то спэцыяльна, ці то выпадкова падпаліў тры сьцірты саломы паблізу ад вёскі Дзягенева. У нядалёкім мінулым «падпальшчык» быў не апошнім чалавекам у кіраўніцтве гэтай гаспадаркі.

### Лясгас зарабляе

**У Астравецкім лясгасе грошы будуць зарабляць ня толькі продажам драўніны, але і паляўнічым турызмам.** Зусім нядаўна пад «лесьнічоўку» купілі будынак зачыненай Дравяніцкай пачатковай школы, дзе зрабілі капітальны рамонт. У плянах лесаводаў — запрашаць на паляваньне заможных грамадзянаў. Першымі сюды палявацць на дзікоў зьбіраюцца прыехаць немцы.

**Мар'ян Вянгроўскі, Астравец**

### Кніжкі і паўлітры

**На гэтым тыдні Горацкае райспажыўтаварыства вырашыла адчыніць у адзінай гарадзкой кнігарні аддзел для продажу сьпіртных напояў.** Кіраўніцтва спажывецкага таварыства сьцьвярджае (і, пэўна, небеспадстаўна), што




кнігі ў наш час не карыстаюцца попытам. Менавіта з гэтай прычыны кнігарню цяпер будзе падтрымліваць «прадукцыя шырокага попыту». Жыхары зьдзіўляюцца, як можна побач з кнігамі прадаваць гарэлку. Да таго ж, многія хваліюцца за сваіх дзяцей, якім давядзецца набываць контурныя карты ды абэтку ў тым самым месцы, дзе задавальняюць свае патрэбы аматары «гарачых» напояў.

Адзіная ў горадзе кнігарня, якая знаходзіцца побач зь сярэдняй школай №2, даўно займаецца ня толькі продажам кніг. Недзе з год там працуе аддзел для продажу посуду, электрапрыладаў і пасьцелі.

**Ільля Заранок, Горкі**

### Lepš addaj sam

**U Baranavičach abrabavali zabitych savieckich žaŭnieraŭ.** Skradziena memaryjalnaja doška sa skveru ŭ honar sałdataŭ, što zahinuli ŭ Aŭhanistanie. Adlitaja z prostaha metału, šylda była ŭstalavanaja na kamieni. Niedaloka znachodzicca pomnik «aŭhancam» (ź jakoha niekalki hadoŭ tamu taksama byli źniali fihurku savieckaha sałdata) i Baranavicki rajvykankam.

Šancaŭ, što złaździejaŭ znojdzie milicyja, niašmat. Byłyja «aŭhancy» źviarnulisia praz aficyjnuju hazetu «Naš kraj» z prapanovaju pa-dobramu viarnuć došku. Inakš jany pahražajuć svaim raśśledavańniem i nahadvajuć pra ciažki hrech pierad Boham.

**Rusłan Raviaka, Baranavičy**

### Маглі і «Касандрай» назваць

**Вялейскі райвыканкам нададаў гімназіі на пл.Свабоды, 2 статус гімназіі №1 «Лёгас».** Неабходнасьць мець свой назоў вынікла ў сувязі зь пераўтварэньнем сярэдняй школы №4 таксама ў гімназію. На аснове конкурсу з шматлікіх варыянтаў (такіх, як «Спадчына», імя Ф.Скарыны, «Фэнікс», «Касандра») ён і быў абраны.

«Лёгас» — гэта адначасова і слова, і сэнс слова, арганічныя й цэльныя веды, якія ўтрымліваюць аналіз і інтуіцыю, розум і пачуцьці. Шкада толькі, што беларускасьці яму не стае.

**Алесь Вялейскі**

### Трагедыя на Нарачы

**Падчас рыбалкі на Нарачы патануў кандыдат у майстры спорту па плаваньні.** Купка менчукоў вырашыла парыбачыць на лодцы, а тая перакулілася. Трое трымаліся за яе краі, а найвопытнейшы паплыў па дапамогу. Але да берагу ён не даплыў.

**КА, Мядзел**

**Філярманічны сэзон пачаўся Сымфоніяй №11 Зьмітра Смольскага і абвастрэньнем канфлікту між дырэкцыяй і аркестрам.**

# «Sonorus» як дабро і ліха


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Язэп Турко

У адной з кнігаў пра Гары Потэра напісана: калі навесьці на чалавека чарадзейную палачку і сказаць «Sonorus», яго голас стане гучнейшым у некалькі разоў. Артысты Дзяржаўнага сымфанічнага аркестру часта паўтараюць: «Sonorus», «Sonorus». І ня толькі таму, што ў халоднай залі былога кінатэатру «Сучасьнік» іх інструмэнты губляюць голас.

1 верасьня вандроўнае існаваньне філярманічных калектываў мусіла скончыцца адкрыцьцём сэзону ў аднаўленым будынку. Аднак раптам высьветлілася, што ад Філярмоніі засталіся толькі муры. Для сканчэньня рэканструкцыі спатрэбіцца ў два разы болей грошай, чым плянавалася спачатку, і рамонтныя работы зацягваюцца на няпэўны тэрмін.

Тут болей прыдалася б заклінаньне «Ruparo», з дапамогаю якога сапсаваны прадмет робіцца як новы. Але аркестранты ўпарта паўтараюць: «Sonorus», «Sonorus». Бо гэтак завецца музычны калектыў, якім паралельна кіруе дырэктар Філярмоніі Аляксей Шут. Некаторыя бачаць у гэтым калектыве дадатковую крыніцу заробку; іншыя — крыніцу ліха, якое перасьледуе аркестар.

## Дзірка ў аркестры

Розум аркестру — галоўны дырыжор. Яго чарадзейная палачка стварае добрую атмасфэру творчасьці, любові і шчасьця. Але ў нашым выпадку пра гэта застаецца толькі марыць.

Першая дзірка ў калектыве ўтварылася пасьля таго, як у 1991 г. памёр шматгадовы кіраўнік аркестру Юры Яфімаў. Неўзабаве пайшоў з жыцьця й ягоны наступнік Віктар Дуброўскі. Далей падзеі разгортваліся як зь векапомнай дзіркай у філярманічнай столі, якая стала першай вястункай цяперашняе разрухі. Дзірку аркестравую спрабавалі цыраваць — запрашалі розных дырыжораў. Але тыя ці адразу адмаўляліся, ці хутка з гэтай пасадай разьвітваліся. «Па просьбе працоўных» пазбавіліся ад швайцарца П'ера Дамініка Панэла. Той прымушаў аркестрантаў працаваць над грандыёзнымі сымфоніямі Брукнэра, Малера і Шастаковіча, а аркестру гэта было ня надта цікава. Бо ў музыкаў сем'і, дзеці, хочацца дахаты прыйсьці своечасова і адпачыць. А не зудзець да паўночы які-небудзь няўдзячны пасаж, рызыкуючы нажыць прафэсійнае захворваньне.

Тое самае выйшла і з Генадзем Праваторавым, хоць ён быў для аркестру бацькам родным. Раз выбраліся на гастролі ў Нямеччыну, ня ведаючы нават, якія творы давядзецца граць. Ратаваў Праватораў. Любую партытуру ён ведаў дэталёва. Рэпэтавалі толькі самыя складаныя ўрыўкі. Потым выходзілі на сцэну і без падрыхтоўкі гралі сымфонію ці ўвэртуру цалкам. І фокус заўжды ўдаваўся. Праватораў і ў родных філярманічных сьценах рабіў цуды, выдабываючы з аркестру надзвычайнай прыгажосьці гучаньне, а з публікі — сьлёзы.

На Захадзе балянс паміж інтарэсамі высокае музыкі і прозай жыцьця дасягаецца проста. Прафсаюзы сочаць за ўмовамі працы музыкаў, і нават самыя «крутыя» дырыжоры мусяць зь імі лічыцца. Калі аркестрант страціць працаздольнасьць па віне занадта патрабавальнага дырыжора, апошні да канца сваіх дзён будзе выплачваць кампэнсацыю. Затое дырыжор заўжды можа звольніць нядбалага і абыякавага аркестранта. У нас адзіны сродак вырашэньня гэткіх праблемаў — ліст у Мінкульт. У выпадку з Праваторавым чыноўнікі спрытна выкарысталі «голас народу» (некаторыя аркестранты скардзіліся на «залішні працоўны фанатызм» дырыжора). І яго ўмэнт замянілі на Аляксандра Анісімава.

22 верасьня сп.Анісімаў урачыста распачаў свой трэці сэзон на чале Дзяржаўнага сымфанічнага. Адміністратары філярмоніі спадзяваліся, што яго імя на афішы спракавуе ў аматараў музыкі ўмоўны рэфлекс. Аднак заля зеўрала пустымі фатэлямі. Маэстра дырыгаваў «Сымфоніяй №11» Зьмітра Смольскага (першае выкананьне), «Балеро» Марыса Равэля і першым актам «Валькірыі» Вагнэра.

Прэм'ера — не найлепшая нагода, каб ацаніць якасьць выкананьня. Слухаеш музыку, а не падрабязнасьці інтэрпрэтацыі. Тым болей што твор Смольскага вельмі сьмелы і нестандартны. Эпіграф зь Фёдара Цютчава («Умом Россию не понять...») выклікаў неўразуменьне. Але пасьля кантрабасы п'янымі галасамі зацягнулі «Что стоишь, качаясь...» (на гэтай мэлёдыі пабудаваная амаль уся сымфонія). І сталася відавочным, што кампазытар задумваў ня гімн у гонар Расеі, а гратэск у стылі «Капрычас» Гоі. П'яныя песьні зьмяняліся водгукамі вайны і крымінальных разборак, крыкамі і стрэламі. З тупой настырнасьцю лез у вушы пашлаваты катрынкавы вальсок...

У сярэдзіне сымфоніі ненадоўга запаноўвае спакой — як ціхі востраў у атрутных водах. Потым ізноў буяе стыхія разгулу, а ў канцы — ціхая і самотная сьмерць, якой паміраюць бамжы на марозе, рэквіем па жыцьцю, якога ўвогуле не было, і нясьмелая нотка надзеі. Я выслухала ўсё гэта з захапленьнем.

А потым было «Балеро» Равэля. Ад 1956 г., калі была скасаваная забарона на музыку «буржуазнага Захаду», нашыя аркестры выконваюць яе штосэзону. Але гэткага неахайнага, халоднага, мёртвага «Балеро» мы яшчэ ня чулі. Дзе экстатычная напружанасьць жарсьці? Дзе гарачы афрыканскі вецер, што залятае ў дзьверы сэвільскай тавэрны? Дзе палкае флямэнка? Я ўжо не кажу пра безьліч тэхнічных памылак.

> Кантрабасы п'янымі галасамі зацягнулі «Что стоишь, качаясь...» П'яныя песьні зьмяняліся водгукамі вайны і крымінальных разборак, крыкамі і стрэламі.

Дый як магло быць інакш? Сп.Анісімаў, паглынуты новымі абавязкамі ў Растоўскай опэры, абмежаваўся адзінай рэпэтыцыяй. Апроч таго, цягам цэлага верасьня аркестар рыхтаваўся да опэрнага фэсту ў Вэксфардзе (Ірляндыя). Сёлета калектыву ўжо трэці раз выпадае пачэсная функцыя: акампаніяваць падчас спэктакляў. У гэтым годзе на фэстывалі прагучаць тры малавядомыя опэры: «Тры пінты» Вэбэра, «Марыя дэль Кармэн» Гранадаса і «Шванда дудар» Вайнбэргера. Партытуры вельмі складаныя. Дапамагчы нашым музыкам у Менск прыяжджалі італьянец Паола Арывабэні, англічанін Джуліян Рэйналдс і бэльгіец Макс Брагада-Дарман, што будуць працаваць з калектывам у Вэксфардзе.

## Шут і магнацкая капэла

Удзел беларусаў у прэстыжным фэсьце — заслуга дырэктара калектыву Язэпа Турка. Гэты сьціплы і мудры чалавек стаўся сапраўдным лідэрам аркестру, замест непрыступнага галоўнага дырыжора. Ня гэтак даўно сп.Турко адшукаў для калектыву яшчэ аднаго дырыжора — амэрыканку Карэн Ніксан-Лэйн. Яна знайшла ў Беларусі астравок мастацтва і дабрыні, які стаўся для яе апірышчам. Зь ёй аркестранты адпачываюць душой і робяць сапраўдную музыку.

Турко забясьпечыў аркестар новымі крэсламі, пультамі, канцэртнай вопраткай і абуткам. Але галоўнае — забясьпечыў надзеяй на лепшае. І гэтую надзею ў аркестрантаў спрабуюць адабраць. Аркестранты пэўныя, што «ідэалёгія» — толькі зручная нагода, каб пазбавіцца ад Турка, а перасьлед пачаўся яшчэ ўлетку. Яго прымусілі з уласнае кішэні аплачваць мыта — мільён рублёў — за прысланыя з Вэксфарду ноты. Дырэкцыя філярмоніі адмовілася дапамагчы, хаця гэта яе непасрэдны абавязак. Не дапамагла яна і з набыцьцём ірляндзкіх візаў. Турко за свае грошы езьдзіў у Маскву і вырашаў гэтую праблему.

Аркестранты баяцца страціць Турка, бо памятаюць ранейшых адміністратараў. Яны баяцца страціць і амэрыканскую дырыжорку, бо яна не жадае кантактаваць ні з кім, апроч Турка. Яны не разумеюць, чаму дырэктар філярмоніі Аляксей Шут — таленавіты музыка, а не намэнклятуршчык! — апусьціўся да гульняў з падначаленымі. Падазраюць, што прычынай зьяўляецца музычная капэла «Sonorus» — любае дзіця маэстра.

У лістападзе «Sonorus» на чале з Шутом выпраўляецца на гастролі ў Гішпанію. Разам зь ёй паедзе частка музыкаў сымфанічнага аркестру. Турко ня супраць. Але цалкам магчымая такая сытуацыя, калі гастролі аркестру супадуць у часе з гастролямі капэлы. І няма пэўнасьці, што Турко саступіць Шуту сваіх музыкаў. Між тым, аркестранты Шуту патрэбныя. Ён імкнецца адрадзіць беларускую магнацкую капэлу, у якой былі і харысты, і салісты, і аркестранты. Яскравы прыклад — слонімская капэла Радзівілаў XVIII ст., што складалася з 120 музыкаў. У капэле «Sonorus» сваіх аркестрантаў няма. Ці не таму сп.Шут так ціснуць на адміністрацыю сымфанічнага аркестру?

Яшчэ адна акалічнасьць. У ліпені 2002 г. сп.Шут абнародаваў свой плян стварэньня абласнога опэрнага тэатру на аснове капэлы «Sonorus». Марыў нават здабыць памяшканьне ў Менску. Не пасьпеў: перашкодзіла прызначэньне на пасаду дырэктара філярмоніі. Але ці сп.Шут забыўся на тыя пляны? Сёньня ён мае моцную падтрымку звонку: для капэлы пішуць творы Андрэй Мдзівані, Алег Залётнеў, Людміла Шлег, Алег Хадоска... Але патрэбная й падтрымка зь сярэдзіны.

Файна было б, каб адзін калектыў не замінаў другому. Каб у дзяржавы знайшліся сродкі ўкамплектаваць «Sonorus» прафэсійнымі аркестрантамі — кадраў хапае. І тады спакойна існаваў бы Дзяржаўны сымфанічны аркестар з сваімі задачамі ў мастацтве, сваім дырэктарам, сваімі музыкамі і сваім унутраным жыцьцём, у якое начальству безь неабходнасьці ня варта ўмешвацца. Бо калі ў мастацкіх арганізацыях пачынаецца вайна, выйграюць антымастацкія сілы, якія клапоцяцца пра мускулы беларусаў, а не пра іх душы. Артысты Філярмоніі даўно ўжо гэта зразумелі. Спадар Шут — чалавек новы, і яму яшчэ давядзецца вучыцца ў старэйшых з музыкамі абыходзіцца безь вядзьмарства.

**Юлія Андрэева**

# Ратуйма папсу!



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Сумна, але факт: за першы дзень продажу альбому Зэмфіры «14 тыдняў цішыні» разышлося нешта блізу 1000 паасобнікаў (у адной зь менскіх музычных крамаў), а першай «Крамбамбулі» за той самы тэрмін у той самай краме ды яшчэ і з прысутнасьцю музыкаў — 50 паасобнікаў.** Уяўляеце розьніцу? Роўна 20 разоў. Гэтак жа і з канцэртнымі выступамі: Зэмфіра — стадыён «Дынама», «NRM» — ДК «Сукно». І гэтак ужо ня першы год, а што рабіць?

Калі паглядзім у афішы — здаецца, жывём! Клюбы, канцэртныя залі, палацы культуры. Але ж глядач той самы. Як існуе ў нас пэўнае рок-н-рольнае кола, гэтак жа існуе і глядацкае кола, што зь цягам часу чамусьці не пашыраецца. Каб прыцягнуць увагу слухача, патрэбна выпусьціць нешта прынцыпова новае. Таму людзі (паводле маіх уласных назіраньняў) ведаюць лепш «Крамбамбулю», што мэтэорам уварвалася на музычны рынак, чым «NRM». Людзі жадаюць сьмяяцца. Дык чаму б і не? Ратуйма папсу!

Вось, напрыклад, спадар Памідораў запісаў цудоўны (адно што пэрсанальны) дуэт з Аляксандрам Сухаравым («Эківокі») «Дэпрэсія». І каб ня надта рокавы імідж Памідорава, гэта мог бы быць гіт, ня горшы за Эмінэмавы. І былі б і ратацыі, і канцэрты. А Вольскі зь Міхалком на «Каралях раёну» — гэта ж «Modern Talking».

А яшчэ б прапанаваў рок-каранацыю перайменаваць у проста «Каранацыю», а канцэрты хоць зрэдзьчас даваць на адкрытых пляцоўках, бо сядзець на нейкіх маленькіх залях з двума дзясяткамі слухачоў ды енчыць, што «ўсім на ўсё пляваць», — гэта самагубства для музыкі.by

**Сяржук Дэнскі, Менск**

# Навошта па-беларуску?

**Апошнім часам на старонках беларускага друку можна стрэць завочнае абмеркаваньне пытаньня «Навошта я размаўляю па-беларуску?»** У гэтым можна пабачыць прагу беларускамоўнага чалавека да самааналізу, да спасьціжэньня сэнсу свайго беларускамоўя і свайго існаваньня наагул. Прыкметна, што сэнс нярэдка і знаходзіцца менавіта ў беларускамоўі.

Мэтазгодна было б разгледзець меркаваньні двух прадстаўнікоў сусьветнай навуковай думкі. Іх погляды здаюцца вельмі цікавымі ў нашым кантэксьце.

Першы зь іх — Вільгельм фон Гумбальт, заснавальнік агульнага мовазнаўства, філёзаф і палітычны дзяяч. Гумбальт належыць да плыні нямецкай клясычнай філязофіі і лічыцца пасьлядоўнікам Іягана Готфрыда Гердэра, якому, у прыватнасьці, належыць меркаваньне, што геній народу больш за ўсё бачны ў аблічны ягонага маўленьня.

Ідэі Гумбальта можна інтэрпрэтаваць як прызнаньне ўнікальнасьці кожнай мовы. Ён лічыў, што адна з галоўных функцыяў мовы наагул — забесьпячэньне агульначалавечай здольнасьці трансфармаваць аб'ектыўную рэчаіснасьць у суб'ектыўную. Аднак здольнасьць гэтая не рэалізаваная цалкам ні ў адной з моваў, а раскіданая па іх усіх.

Асабліва цікавым падаецца погляд Гумбальта на сутнасьць мовы. Згодна зь ім, мова — гэта ня нешта фіксаванае, застылае. У яго канцэпцыі алегорыяй мовы ніяк нельга было б назваць, скажам, слоўнік альбо альфабэт. Наадварот, ён лічыў мову дзейнасьцю духу, энэргіяй народу, то бок рэчывам дынамічным і несупынна зьменлівым. З гэтага Гумбальт рабіў выснову, што падчас зносінаў чалавек штораз стварае мову ў самім сабе.

У гэтым можна пабачыць шчэ адзін сэнс беларускамоўя. Калі мова ствараецца ці, прынамсі, узнаўляецца ў чалавеку пры кожным акце зносінаў, дык чалавек паводле аналёгіі зь вядомым выказваньнем францускага караля можа сказаць: «Мова — гэта Я!» А ў нашым выпадку — «Беларуская мова — гэта Я!». Вядома, тут ня маецца на ўвазе, што беларуская мова — гэта і ёсьць усе памылкі і недарэчнасьці маўленьня альбо стылю пэўнага носьбіта. Таму для сьціпласьці трэба ўдакладніць: «Беларуская мова — гэта таксама і я!».

Уявіце, якая адказнасьць за лёс мовы зьяўляецца пры такой пастаноўцы пытаньня. Гэта ўжо нават не інтэрпрэтацыя Беларушчыны як толькі часткі свайго жыцьця, гэта нешта большае, нейкі інтэграл асобы і сьвядомасьці.

Цяпер хацелася б зьвярнуцца да поглядаў іншага навукоўца — Віктара Франкла, псыхоляга, псыхатэрапэўта, дасьледчыка праблемы сэнсу існаваньня. Кантэкстам звароту да яго ідэяў служаць рэдкія выпадкі сьвядомага беларускамоўя, а таксама сумнавядомыя азначэньні беларускамоўных як «касты і сэкты».

Франкл пастуляваў, што быць — значыць адрозьніваць. Менавіта адрозьненьне ёсьць падмуркам існаваньня чалавека як асобы. Пры гэтым Франкл падкрэсьлівае, што ў натоўпе чалавек губляе найважнейшую з сваіх уласьцівасьцяў — адказнасьць. Больш за тое, сапраўдная свабода для чалавека пачынаецца тады, калі ён пачынае супрацьстаяць уласнаму тыпу. Выходзіць, што беларускамоўе можа быць сапраўдным падмуркам сталай і свабоднай чалавечай асобы, не пазбаўленай, аднак, адказнасьці.

У абмеркаваньнях праблемы беларускамоўя калі-нікалі можна пачуць і выказваньні людзей, што, «у прынцыпе, за мову, але з практычных меркаваньняў яе цураюцца». У таго ж Франкла знаходзім ідэю разьвіцьця асобы, якое магчыма толькі пры ўмове выхаду чалавека «за межы сябе», пэўным адмаўленьні ад каштоўнасьцяў карыстаньня і пераходзе да творчага ладу жыцьця. Прыгадаўшы Гумбальта, можна сказаць, што карыстаньне мовай — таксама творчасьць.

Такім чынам, ужываньне беларускае мовы — гэта невычэрпная крыніца ўнікальных асабасных сэнсаў і каштоўнасьцяў, сапраўдны акт творчасьці. Франклам, зрэшты, як і шмат кім іншым, адзначалася, што ўнікальны сэнс сёньня — гэта ўнівэрсальная каштоўнасьць заўтра.

**Дзяніс Тушынскі, Менск**

### АД РЭДАКЦЫІ

Мова не належыць чалавеку адназму. Яна была да нас і будзе пасьля нас. Чалавек яе прымае і перадае. Да захаваньня ж ды перадачы эстафэты беларускае мовы носьбіты расейскае культуры почасту ставяцца агрэсіўна. Думаючы па-беларуску, гаворачы па-беларуску дома ці між сваімі, людзі (лічбы былі выяўленыя падчас апошняга перапісу, і яны агаломшылі зламысната Замяталіна) дагэтуль баяцца размаўляць на гэтай мове публічна — у крамах ці транспарце. Ото ўбіты страх вякамі кпінаў. Дарэчы, «сэкта» ці «каста» ў Вашым, спадару Тушынскі, лісьце — гэта навязаная нашчымысна нэгатыўная тэрміналёгія, якой трэба папросту ўнікаць, як любой калянізацыі розуму.

Бяда ж у тым, што беларуская сярэдняя школа выпускае людзей — за рэдкімі выняткамі — непісьменнымі ў беларускай мове і неабазнанымі ў беларускай культурнай традыцыі (гэтак жа ганебна блага — акрамя як у жменьцы элітных установаў — навучаюць і замежнай мове, дый многім іншым прадметам). Дай ты нармальную сярэднюю школу, і зьнікне паўсюдная і паўсікная няўпэўненасьць ва ўласнай беларускай мове. Ад якой і ідзе боязь публічнае беларускасьці. Таму, спадару Тушынскі, дзеля беларускае мовы — змагайцеся за тое, каб крэслы ў Міністэрстве адукацыі занялі нарэшце людзі, здольныя зрабіць сярэднюю школу школай, якая дае нармальныя моўныя веды.

Беларусь ня першая краіна, дзе народныя гаворкі моцна розьняцца ад літаратурнае, цэнтралізуючае мовы. І скрозь давала рады народная адукацыя, г.зн. дзяржаўная палітыка, якая вызначала таксама мову войска, публічных абвестак і г.д. Не спыняйце змагацца за палітыку, безь якой псыхалягічныя тэорыі будуць рабіць зь беларускамоўя толькі прыватны, хоць і прыцягальны, выпадак.

Перш чым акт творчасьці ці спосаб пратэсту, беларуская мова для беларуса — гэта перадусім натуральная мова, адмова ад штучнага стану сябе. І добра, што Вам пра мову, словы, маўленьне думаецца. Гэта, зноў жа, натуральна для беларуса, які мае аднастайную такую багатую, хоць такую сацыяльна ўразьлівую мову. Каб захаваць сваё панаваньне, «общепринятый» здаровы сэнс выдае нам незацікаўленасьць гэтым займальным пытаньнем за «норму», а на кожнага, хто пра мову дбае, хто ёю захапляецца, як аматар — спортам, вешае ярлык «национально озабоченного». Нічога дурнейшага не прыдумаеш.

# Traščanok Vs. «mamie-łošn»

**Niešmatlikija ciaper nošbity idyšu ŭ Biełarusi nazyvajuć jaho zazvyčaj «mamie-łošn», to bok «matčyna mova».** U «Biełaruskaj encyklapedyji» (1998) idyš traktujecca jak «adna z hiermanskich moŭ», što «skłałasia ŭ X—XIV st. na bazie adnaho ź vierchnie-niamieckich dyjalektaŭ». Adnak sp.Jakub Traščanok, mahiloŭski aŭtar «Historyji Biełarusi» (2003), raspluščyŭ vočy tysiačam biełaruskich habrejaŭ, papraviŭšy zaadno i encyklapedystaŭ. Akazvajecca, u XVIII—XIX st. habreji tutaka «говорили на «идиш» — искаженном немецком диалекте…». «Skažony dyjalekt» — da takoha navat za Stalinym nie dadumvalisia. U 1920-30-ja idyš byŭ adnoj z čatyroch aficyjnych moŭ u BSSR.

Chočacca pažadać śmełamu historyku pajšci dalej. Čamu b, naprykład, nie abviaścić italjanskuju movu dyjalektam francuskaj, a biełaruskuju — dyjalektam ukrajinskaj abo naadvarot? Treba čakać uhanaravańnia sp.Traščanka premijaj imia načalnika Akademiji navuk nia tolki za vykryćcio «nacyjanał-ekstremistaŭ» kštałtu Kastusia Kalinoŭskaha, ale j za vydatnyja dasiahnieńni ŭ halinie movaznaŭstva. Praŭda, było b spraviadliva, kab jon padzialiŭsia hetaj premijaj z układalnikam vialikaha idyš-biełaruskaha słoŭnika, vydańnie jakoha ŭ Miensku pad pytańniem dziela braku hrošaj. U tym słoŭniku, miž jinšaha, jość prymaŭki, jakija vydatna pasujuć da sytuacyji: «Zaj nit kejn nar, vet men fun dir nit łachn» — «Nia budź durniem, kab ź ciabe nie rahatali», «A nar halt ałemen far naronim» — «Durań trymaje ŭsich za durniaŭ». Karyść była b ahulnaja, choć i kažuć amatary «skažonaha dyjalektu», što «a nar iz umegłech ojshejln» — «durnia nielha vylačyć». Niezdarma ž adzin z najmacniejšych praklonaŭ u idyšy: «Got zoł af dir onšikn a nar!» — «Kab na ciabe Boh durnia nasłaŭ!»

**Wolf Rubinčyk, Miensk**

# Паядальнікі часу

**Я працую ў раёне плошчы Перамогі, а жыву ў Серабранцы.** І штовечара вяртаюся дахаты трамваем. Бывае, забавішся на працы гадзіны да 21-й ці 22-й, а пасьля даводзіцца выстойваць на прыпынку добрых дзьвацаць хвілінаў. Такім чынам, у тыдзень я губляю на гэта каля гадзіны свайго жыцьця. Чатыры гадзіны ў месяц, сорак восем гадзінаў у год. Двое сутак. Шэсьць поўных працоўных дзён. Памножце на сорак—пяцьдзясят чалавек маіх трамвайных спадарожнікаў... Людзі маглі б зарабляць грошы, чытаць, быць зь сям'ёй, а яны на прыпынку стаяць.

Я не спрабую павесіць чарговага сабаку на мэрыю, у якой не хапае грошай на дадатковыя трамваі. Але чым больш маеш часу — тым больш зарабляеш, тым лепшы ты спажывец, тым болей ад цябе карысьці таму ж гарадзкому бюджэту. А чым багацейшы бюджэт, тым большая імавернасьць, што залаты дождж датацыяў пралiецца, нарэшце, і на трамвайнае дэпо. Во якая тут бачыцца хітрая сувязь.

**Пятро Пылін, Менск**

# Ідэалёгія «а на храна»

**Пра «ідэалёгію» чулі ўсе, але мала хто разумее, што гэта такое, а іншыя зусім адмаўляюць яе існаваньне.** Аднак, на жаль, яна існуе. Да такой высновы падштурхнула сытуацыя з заявамі ў БРСМ у маёй навучальнай установе, ня буду яе называць. У адзін цудоўны дзень у кабінэт зайшла куратарка і аб'явіла, што ўсім трэба напісаць заявы аб прыняцьці ў БРСМ і прафсаюз у добраахвотна-прымусовым парадку. Неадназразова чуў пра такія здарэньні, аднак наіўна думаў, што мо мяне й пранясе. Аж не! Калі сказаў, што не ўступлю, хай лепш выганяюць, куратарка аж пабялела ў твары. «Ты ж толькі ня ўздумай, калі цябе пачнуць цягаць па начальству, казаць, што адмаўляешся ўступаць з палітычных прычынаў, кажы, што з рэлігійных» (sic!). Аднак добра ўжо тое, што нікуды не «цягалі». І выстаўляць сябе якім прыхільнікам руху «Харэ Крышна» ці даасістам не давялося.

Калі пытаюся ў аднагрупнікаў, якія вельмі скептычна ставяцца да дзейнай улады, навошта ўступаюць, дык чую ў адказ: «А на храна мне, каб цэлы год куратарка кампасьціравала мазгі». Вось тут і сутыкаемся мы зь дзяржаўнай ідэалёгіяй «анахранізму». «А на храна мне выдзяляцца, ускладняючы сабе жыцьцё?» — дзень пры дні чуем мы ад мноства людзей. Ідэалёгія працуе. ППРБ можа адкаркоўваць пляшку савецкага шампанскага, сьвяткуючы часовую перамогу. Часовую, бо гэтая ідэалёгія вельмі небясьпечная для любой улады: у любы момант плебс можа задаць пытаньне: «А на храна нам гэта ўлада?»

**Адась Галубовіч, Барысаў**

# Фрык рыхтуе помсту

**Гельмут Фрык**, пасол Нямеччыны, заявіў, што выдварэньне Яна Буша і Штэфана Кемэрлінга за межы Беларусі можа «ўскладніць адносіны» між краінамі. Урад ФРГ рыхтуе захады ў адказ. Казаў гэта Фрык на прэс-канфэрэнцыі з нагоды аб'яднаньня Нямеччыны. Пакуль ня выправілі Кемэрлінга, немцаў пераконвалі, што праблема ў асобе Яна Буша, а ня ў справе, якой займаюцца тут нямецкія сацыялісты. Цяпер нямецкія дыпляматы вядуць кансультацыі адносна таго, якія могуць быць захады ў адказ.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Гельмут Фрык

# Пераможны Латушка

Прафэсар **Лонгін Пастусяк**, маршалак польскага Сэнату, прыедзе ў Менск, каб 4 кастрычніка ўрачыста адчыніць помнік Адаму Міцкевічу. Зробіць ён гэта разам з Генадзем Навіцкім. У Менгарвыканкаме падкрэсьліваюць, што візыт мае непалітычны характар. Аднак значна тое, што ад 1996 г. польскія палітыкі такога рангу Беларусь не наведвалі. Гэта вялікая дыпляматычная перамога беларускага пасла ў Варшаве **Паўла Латушкі**.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Павал Латушка

Футбаліст **Аляксандар Глеб** забіў першы гол у новым сэзоне футбольный бундэсьлізі. 27 верасьня яго ны «Штутгарт» усухую (3:0) перамог «Мюнхен-1860». Наш легіянэр закаціў апошні мяч. «Штутгарт» займае першае месца ў чэмпіянаце Нямеччыны.



ALEX-HLEB.NM.RU

**53 беларусы** атрымалі статус уцекача ў Польшчы. Зьвярталіся па гэта за дзевяць гадоў 350 чалавек. Першыя шэсьць просьбаў былі задаволеныя ў 1998-м. Але палітычнага прытулку не атрымаў пакуль ніводзін замежнік. Чалавек, пакуль атрымае статус уцекача, знаходзіцца ў спэцыяльным цэнтры (у Польшчы іх 11, у асноўным гэта былыя вайсковыя гарнізоны). У кожным цэнтры — 200—300 чалавек. Кожны «чакальнік» каштуе дзяржаве 200 даляраў у месяц.

**Ягор Рыбакоў** ня грэбуе падзаробкамі. Мільён рублёў ён атрымае ад **Элеаноры Язерскай**. Гэткі штраф ёй даў суд, прызнаўшы несапраўднымі зьвесткі, надрукаваныя ў «Народнай волі» аж у кастрычніку 2001 г. Аўтарцы артыкулу «Элеанора Язерская: пяць пудоў любві» Марыне Коктыш выпісалі гэтулькі сама, газэце — у дзесяць разоў болей. У артыкуле Язерская казала, што Рыбакоў «ператварыў БТ у руіны», а таксама вінаваціла яго ў датычнасьці да сьмерці некаторых былых супрацоўнікаў. Рыбакоў прызнаўся, што рыхтуе яшчэ дзясяткі аналягічных пазоваў — усе супраць незалежных выданьняў.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Старшы прапаршчык **Юры Мікалаёнак** вырасьціў на лецішчы ў вёсцы Восава (Крупшчына) 35-кіляграмовы гарбуз і цыбуліну на паўкілі.

**Джанфранка Фіні**, італьянскі віцэ-прэм'ер, заявіў, што Італія зацікаўленая ў нармалізацыі адносінаў нашае краіны з ЭЗ. Сам Фіні, дарэчы, зьяўляецца лідэрам партыі «Нацыянальны альянс» — пераемніцы фашысцкае партыі.

На думку **Анатоля Чубайса**, РФ мусіць збудаваць на постсавецкай прасторы «ліберальную імпэрыю». У яго разуменьні гэта мусіць рабіцца шляхам экспансіі расейскага бізнэсу ў суседнія краіны, дзяржаўнай падтрымкі ў іх расейскай культуры «і культуры іншых народаў», пашырэньня «законнымі мэтадамі» свабоды і дэмакратыі ня толькі ў Расеі, але і ў дзяржавах-суседзях. Адным з тых ліберальных мэтадаў магло б быць адключэньне электрычнасьці.


ITAR-TASS

**Леанід Кучма** паведаміў у аўторак, што не зьбіраецца браць удзел у наступных выбарах ды ісьці на трэці тэрмін. Выбары прэзыдэнта Ўкраіны маюць адбыцца ў кастрычніку 2004 г.

# Вайны магло ня быць

Італьянскі дыктатар **Бэніта Мусаліні** прасіў **Папу Пія XI** адлучыць Гітлера ад царквы. Было гэта ў 1938 г., незадоўга да ўступленьня Італіі ў саюз з фашысцкай Нямеччынай. Інфармацыя адшукалася ў рассакрэчаных архівах Ватыкану. Мусаліні быў занепакоены прэтэнзіямі Гітлера на суседнія паняваньне і аншлюсам Аўстрыі. Хто ведае, як пайшла б гісторыя, калі б адлучэньне адбылося. Мо й сусьветная вайна не была б такой працяглай.

**Хілары Клінтан** адцэнзуравалі. Яе мэмуары «Жывая гісторыя» нядаўна былі перакладзеныя на кітайскую мову. Усё, што тычылася Кітаю, адтуль выкрасьлілі, а што й пакінулі — зьмянілі (арыштаваны праваабаронца


AFP

Гары Ву ператварыўся ў «невядомую асобу, затрыманую за шпіянаж»).

**СМ**


## • ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ •

### САДОК

**У дзіцячым садку** ствараецца беларускамоўная група. Папярэдні запіс па тэлефоне: 260-25-73 (Альця), 234-06-12 (Мілана)

### ПРАЦА

**Шукаем** беларускамоўную выхавацельку (дзіцяці пад 3 гады). Т. 216-87-50, 8-0296-64-72-78. Анатоль

**Венскі** вальс ды іншыя танцы. Вясельная харэаграфічная праграма. Т.: 8-029-636-43-08 (Вольга)

**Харэаграфічная** падрыхтоўка дзяцей. Т.: 8-029-636-43-08 (Вольга)

**Шукаю** працу хатняй выхавацелькі. Т.: 228-00-89

**Хлопец** шукае працу (нясталую) на дадатковы заробак. Т.: 8-029-662-09-37

**Пераклады** з ангельскае мовы. Т.: 262-02-90. Пэйдж.: 207-00-00, аб.18199. Хрысьціна

**Хлопец** шукае працу ці дадатковы заробак. 245-84-92 (Зьмітрусь)

### ВІТАНЬНІ

**Віншаваньні** і найлепшыя пажаданьні Ганьне Гучак з нагоды яе сямнаццацігодзьдзя ад яе сям'і

### КАНТАКТЫ

**Шукаю кантактаў** з творчымі людзьмі. Вул.Малініна, 14-155, 220085, г.Менск

**2-і Талькоўскі фэст** адбудзецца 4 кастрычніка ў мястэчку Талька. Пачатак а 12-й

**Студэнтка** прыме ў падарунак кампутар. Пэйджэр 233-00-00, аб.2179. Тацяна

**Здыму** 3-пакаёвую кватэру ва Ўруччы. Т.: 8-029-668-50-71. Андрэй

**«Гарадзенская вандроўка»** прапануе экскурсію «Гісторыя Каложы». Збор ля Каложы а 13-й гадзіне.

**Зьміцер Дашкевіч** і Сяржук Лісічонак! Разам вы — сіла. Мацуйце шэрагі! Браты з МФ

**Малады Фронт** Менску зьбіраецца штачацьвер у 19.00 ля Купалаўскага тэатру. Будзь разам з намі! МФ

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Набуду** ці каб хто падараваў слоўнік Ластоўскага або Некрашэвіча. Т.: 205-97-72

**Кнігі — поштай.** Замаўляйце каталёг: поштай — а/с 333, 220050 Менск, e-mail: exlibris@tut.by, Internet: http://www.knihi.net. Т.: 8-029-643-57-33

**Кнігі — поштай. Новыя**: Ю.Бохан «Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385—1576», У.Арлоў «Таямніцы полацкай гісторыі» і «Адкуль наш род», ARCHE-Пачатак №4/2003 «Чэскі альбом». Т.: 8-029-643-57-33

**Кнігі — поштай. Новыя CD:** Стары Ольса «Verbum» і «Вір», Воплі Відоплясова (4 CD), Znich «Zapaviety apošniaha starca», Deadmarsh «Грані». Т.: 8-029-643-57-33

**Набуду** па нармальнай цане тамы «Беларускага кнігазбору»: Ластоўскі, Геніюш, Баршчэўскі, Багдановіч. Т.: 274-52-65 (Сяргей)

**ЗБМ «Беларускі Шлях»**
запрашае на падарожжа
**11 кастрычніка** (субота):
Менск — Будслаў — Крывічы — Нарач — Камаі — Паставы — Дунілавічы — Лучай — Глыбокае — Беразьвечча — Менск.
**5 кастрычніка:**
Мураванка й Горадня.
Т.: 232-54-58; 8-029-622-57-20 (Зьміцер)


«Наша Ніва» дзякуе Анатолю Васілеўскаму за падтрымку.


**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ______________________________

______________________________

Імя і прозьвішча ______________________________

Адрас, тэлефон ______________________________


## • КОНКУРС «НН» •

# Я Беларус, і тым ганаруся!

Літаратурна-мастацкі конкурс пад такой назвай для школьнікаў 12—14 гадоў абвяшчае Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына». Тэмы: «Што значыць для мяне быць Беларусам»; «Асабістае ўяўленьне і перажываньне роднай культуры»; «Вытокі любові да Радзімы». Журы разглядае малюнкі (памерам А3 і А2), літаратурныя творы (вершы, паэмы, апавяданьні ды інш.). Працы прымаюцца да 15 лістапада. Адрас для дасылкі: МГА «ЗБС «Бацькаўшчына», вул. Рэвалюцыйная, 15, 220030, Менск. Даведкі праз т.: 289-31-94. Пераможцы атрымаюць каштоўныя падарункі.


## КОШТЫ

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў), на старонку 16

**Рэклямныя расцэнкі:**

— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб.

За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб.

Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 360 руб.

Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.

Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764.

На зваротным баку блянку паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».

Даведкі праз т. (017) 284-73-29


## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Генадзю Ц. з Мазыра.** Вы разважаеце па-казацку, а не па-радзівілаўску. Грамадзтва ня можа існаваць без эліты. Пытаньне ў меры сацыяльнае няроўнасьці і эфэктыўнасьці эліты. Ваша ж крытыка агульная, «супраць усіх». Друкаваць не выпадае.

**Кацярыне М. зь Менску, Тацяне Г. з Дружнага.** Прыгожае эсэ павінна зьмяшчаць новыя, раней нікім не фармуляваныя думкі — як машына павінна быць з рухавіком.

**Генадзю Л. з Масквы.** Артыкул Ваш для газэты завялікі, прапануйце ў адзін з часопісаў.


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.

Наклад 3475. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 11.00 1.10.2003.

Замова № 5071.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а